Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу 1 нумару — 20 к. Лімітовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкарэ пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкарэ пасярок тэксту 1 р. — к. За радок шапкарэ перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. ніжэйшага.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 к. За кожны дадатковы . . 15 к. Беспрацоўн. і сялянскарэмісіі за радок . . 15 к. За кожны дадатковы . . 5 к. Публікацыі ЦАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 13 (2502) Чацьвер, 17-га студзеня 1929 г.

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б СКЛІКАЕЦЦА НА 19 СТУДЗЕНЯ 1929 Г. З НАСТУПНАЙ ПАВЕСТКАЙ ДНЮ:

1. АБ ПЯЦІГАДОВЫМ ПЛЯНЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ Ў БССР (ДАКЛАД Т. Т. ГАЛАДЗЕД, КАРКЛІН.)
2. АБ РЭГУЛЯВАНЬНІ РОСТУ ПАРТЫІ (ДАКЛАД. Т. ВАСІЛЕВІЧ).
3. АБ ХОДЗЕ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ (ДАКЛАД. ТАВ. ХАЦКЕВІЧ).

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГАМАРНІК.

Сэсія антыімпэрыялістычнае Лігі Барацьбы.

Дэлегаты Англіі Саклатвала, Мэкстон і Брыджмэн былі гвалтоўна затрыманы пры праезьдзе праз Бэльгію.

Першае пасяджэньне сэсіі.

БЭРЛІН, 15-I. Сёньня ў Кельне адчынілася сесія выканкому Лігі Барацьбы проці імпэрыялізму і прыгнечаньня калёніяльных народаў. На першым пасяджэньні сэсіі была зачытана дэкларацыя пратэсту проці забойства Холіё Мэльля, які быў адным з заснавальнікаў партыі антыімпэрыялістычнае лігі ў Лацінскай Амэрыцы. Пасьля зачытаньня дэкларацыі было ўхвалена распачаць шырокую міжнародную кампанію пратэсту.

Далей з прывітаньнем да сэсіі выступіў прадстаўнік УЦСПС, пасьля прамовы якога прафэсар Альфонс Гольдшмідт зрабіў даклад аб антыімпэрыялістычным руху ў Лацінскай Амэрыцы.

Гвалтоўны ўчынак над ангельскімі дэлегатамі сэсіі.

БЭРЛІН. З Остэндэ паведамляюць, што там затрыманы ангельскія парляментарыі Саклатвала, Мэкстон, а таксама сакратар антыімпэрыялістычнае лігі Брыджмэн. Яны былі ў Остэндэ праездам у Кельн на сэсію выканкому Лігі. Ім было заяўлена, што б льгійскі міністр юстыцыі не дазволіў ім праезду праз Бэльгію, і прапанавана вярнуцца ў Англію.

Артур Кук праехаў праз Кельн без перашкод.

ЗАБАРОНА АДМЕНЕНА.

ЛЁНДАН. Бэльгійскі ўрад скасаваў забарону Мэкстону, Саклатвале і Брыджмэну выехаць у Кельн. Бэльгійская ўлада адмаўляецца даць тлумачэньні ў сваіх учынках.

БЭЛЬГІЙСКАЯ ЎЛАДА ВЫКОНВАЛА ЗАГАД ЧЭМБЭРЛЕНА.

ЛЁНДАН, 15-I. У гутарцы з прадстаўнікамі друку камуністычны сябра палаты вобшчын Саклатвала заявіў па факт затрыманьня яго Мэкстона і Брыджмэна бэльгійскаю ўладаю ў Остэндэ (у часе іх падарожжа ў Кельн на сэсію выканкому Лігі барацьбы проці імпэрыялізму). «Адказнасьць за гэты факт трэба ўскладаць на Чэмберлена. Кожны вучань разумее, што ангельскае міністэрства замежных спраў мела ўплыў на бэльгійскае міністэрства. Ангельскае міністэрства замежных спраў на робіць звычайна нічога само: яно дае магчымасьць другім дзейнічаць замест сябе».

Аўганскія рэакцыянэры перайшлі ў контр-наступ.

РАДЫЁСУВЯЗЬ З КАБУЛАМ ПЕРАРВАНА.

ТАШКЕНТ, 15-1. Учора перад 14-м студзеня радыёсувязь з Кабулам перарвана. З прычыны сьнегападу авіёсувязь з Кабулам таксама спынілася ўжо некалькі дзён.

ШЛЯХ НА КАБУЛ ДЛЯ ПАЎСТАНЦАЎ АДКРЫТЫ.

ТЭРМЕЗ. Водлуг атрыманых тут вестак, наступ паўстанцаў на Чарыкарскай даліне з поўначы на Кабул узмацняецца. Урадавае войска было зьбіта з пазіцыі ля перавалу Хаір-Хана і адступае на Кабул. Прарыў фронту ля Хаір-Хану расчысьціла паўстанцкім атрадам шлях на Кабул.

АМАНУЛА АДРОКСЯ АД ПРАСТОЛУ?

ЛЁНДАН, 16-1. Агенцтва «Рэйтэр» паведамляе з Пэшавару, што ў прымежнай паласе ходзяць упартыя чуткі, быццам Аманула адрокся ад прастолу на карысьць свайго старэйшага брата прынца Інаятулы і выляцеў на самалёце з Кабулу ў Кандагар.

ПАЎСТАНЦЫ ВЫКОНВАЮЦЬ ВОЛЮ АНГЛІІ.

ТЭРМЕЗ, 15-I. Перамовы ў Джэлалабадзе, не зважаючы на шэраг уступак з боку ўрыду, не далі ніякіх вынікаў. Вышэйшае духоўніцтва дамагаецца, каб Аманула пакінуў пасаду падышаха.

Выяўляецца характэрная падрабязнасьць перамоў: паўстанцы, не давяраючы Амануле, які падпісаў загад аб уступках, патрабуюць, каб выкананьне загаду было гарантавана ангельскай місіяй у Кабуле.

ЯПОНІЯ ЗАПУЖВАЕ КІТАЙ ІНТЭРВЭНЦЫЯЙ.

Скарачэньне японскіх войск у Шандуні не прадбачыцца.

ТОКІЁ, 15-1. Учора адбылася канфэрэнцыя заходня-японскае арганізацыі ўрадавае партыі Сэйюкай. На канфэрэнцыі міністра земляробства Ямамота ў вострай форме абвінавачваў нанкінскі ўрад у патрыманьні антыяпонскага руху ў Кітаі. Ямамота патрабаваў самага хуткага і рашучага выступленьня японскага ўраду ў кітайскім пытаньні.

* * *

ТОКІЁ, 15-1. Як паведамляе газэта «Дзі-Дзі», японскі консул у Нанкіне Окамота папярэдзіў нанкінскі ўрад, што ў выпадку антыяпонскіх акцыяў у Ханькоу Японія ўжыве належныя захады абароны.

* * *

ТОКІЁ, 15-1. Японскі друк зазначае, што ў японскіх палітычных колах усё больш распаўсюджваецца перакананьне ў неабходнасьці ўжыць энэргічныя захады ў адносінах да Кітаю. Блізкая да міністэрства замежных спраў „Дзіплёматык Рэв'ю" ў перадавіцы заяўляе, што Кітай на справе вядзе вайну проці Японіі. Антыкітайскія пачуцьці Японіі,—піша газэта,—могуць выліцца ў выбух, калі будзе відаць, што надзей палепшыць становішча больш няма, і што Японія прымушана ўжыць рашучыя захады.

* * *

ТОКІЁ, 15-1. Агенцтва Сімбун-Рэнго паведамляе, што сёньня адбылося пасяджэньне габінэту, на якім абмяркоўвалася становішча ў Ханькоу. Прэм'ер Танака адхіліў чуткі аб надыходзячым нібыта скарачэньні акупацыйнага войска ў Шандуні.

ГАГНЯКІ ГАРУ НЯ СПЫНЯЦЬ СТАЧКІ ДА ПЕРАМОГІ.

ПАРЫЖ, 15-1. Учора адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя бастуючых горнарабочых басэйну Гар. На канфэрэнцыі ўдзельнічала блізка 300 дэлегатаў ад 15-ці тысяч капальнікаў. Канфэрэнцыя адзвагодна выказалася ня спыняць забастоўкі да поўнае перамогі. Адзін з дэлегатаў-рэфарміста прапанаваў зьвярнуцца да міністра працы Лушэра з просьбаю аб пасрэдніцтве, але гэтая прапанова была адзвагодна адхілена.

У часе спрачак на канфэрэнцыі сябры стачачнага камітэту заявілі, што рабочыя прадстаўнікі ў палаце дэпутатаў павінны дамагацца, каб в райёну забастоўкі была выведзена жандармерыя, каб урад прымусіў вугальна-прамысловуюў распачаць перамовы са стачачным камітэтам, каб павялічэньне заработку было праведзена ў заканадаўчым парадку, і каб усе дэпутаты палаты зрабілі адлік у разьмеры індаўла павялічанае дэпутацкае пэнсіі на карысьць бастуючых.

У басэйне Авэйрон адбыліся шматлікія дэманстрацыі горнарабочых.

Амстэрдам імкнуўся да блёку з карпарацыямі Мусаліні

АДХІЛЕНЬНЕ СЭКРАТАРЫЯТУ АМСТЭРДАМУ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАЦЬВЯРДЖАЕ СЭНСАЦЫЙНЫЯ ВЫКРЫЦЬЦІ «СЭНДЭЙ ЭКСПРЭС».

БЭРЛІН. Сэкратарыят Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу адхіляе сэнсацыйнае паведамленьне лёнданскае «Сэндэй Экспрэс», што ў часе пабыту ў Рыму Сітрын і Засэнбах праводзілі перагаворы з Мусаліні, спрабуючы пераканаць яго ў неабходнасьці залучыць фашысцкія прафэсіюзы да Амстэрдамска а Інтэрнацыяналу, але атрымалі адказ са зьнішчаньнем.

Адхіляючы гэтае паведамленьне ангельскае газэты, сэкратарыят Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу падцьвярджае, што Сітрын і Засэнбах з ведама і па даручэньні прэзыдыуму Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу езьдзілі ў пачатку сьнежня ў Італію «з дасьледчымі мэтамі».

«Рота Фаня» знаходзіць гэтае адхіленьне даволі дзіўным. «Ужо адно тое,—піша газэта, што Засэнбах і Сітрын атрымалі ад Мусаліні дазвол на прыезд, у той час, як кожнаму сапыня-дэмакрату Італіі пагражае высылка, даем гчымасьць думаць, што яны усё ж такі меркавалі распачаць перамовы з Мусаліні.

Напярэдадні польскага адказу на 2-ю ноту СССР.

ПОЎНЫ КАНТАКТ ПОЛЬШЧЫ І РУМЫНІІ.

ВЕНА, 15-1. З Бухарэсту паведамляюць, што на ўчарайшым пасяджэньні румынскае палаты міністр замежных спраў Міранеску адказваў на запытаньне аб адносінах Румыніі да мірнае прапановы, зробленае савецкім урадам.

Міранеску заявіў, што польскі ўрад прасіў Румынію неадкладна паведаміць, як глядзіць румынскі урад на савецкую прапанову. З студзеня Румынія паслала Польшчы адказ, якога пакуль што нельга агаласіць. Адзак, ужо зараз можна спыніцца на трох момантах: 1) румынская нота спаткана Польшчаю са здаволеньнем; 2) погляды Польшчы і Румыніі ў гэтым пытаньні не разыходзяцца і 3) адказ Польшчы савецкаму ўраду грунтуецца на тых самых асновах, што і адказ Румыніі Польшчы.

ПОЛЬСКАЯ НОТА ГАТОВА.

ВАРШАВА, 15-I. Польскае міністэрства замежных спраў паведамляе, што польскі адказ на другую савецкую ноту будзе гатовы заўтра.

ППС меняе пазіцыю пад напорам мас.

ВАРШАВА, 15-1. Орган ППС «Робітнік» адмовіўся ад свае ранейшае пазіцыі ў адносінах да савецкае мірнае прапановы (як відаць, пад уплывам невыгаднага ўражаньня, зробленага на масы). „Робітнік" нападае на «Глос Праўды» (орган пілсудчыкаў), які раіў пакінуць савецкую ноту без адказу. „Такая дыплёматыя,—піша „Робітнік",—ня можа прыстасоўвацца ў адносінах да СССР ды ашчэ аб такім значным пытаньні, як праблема міру". «Робітнік» заўважае, што незразумела, чаму друк Пілсудзкага так абуран савецкім адказам.

Сойм ізноў зьняважан Пілсудзкім.

ПАСЛЫ І НА ГЭТЫ РАЗ ПАКОРЛІВА ПРЫНЯЛІ ФЭЛЬДФЭБЕЛЬСКУЮ АПЛЯВУХУ ПІЛСУДЗКАГА

ВАРШАВА, 15-I. На сёньняшнім пасяджэньні бюджэтнае камісіі сойму, на якім распачалося абмеркаваньне бюджэту вайсковага міністэрства, меў месца такі выпадак. На пасяджэньне ня толькі ня прыехаў сам вайсковы міністр Пілсудзкі, але ня быў прысланы нават наме ьнік яго. Дакладчык па бюджэце вайсковага міністэрства Касьцялкоўскі зрабіў, згодна паўнамоцтва Пілсудзкага, паведамленьне, што Пілсудзкі не палічыў магчымым прыслаць каго-небудзь з сваіх афіцэраў на пасяджэньне камісіі, боячыся, што іх там пакрыўдзяць, а ў такім выпадку яны прымушаны будуць у якасьці афіцэраў востра рэагаваць, абараняючы гонар свайго мундзіру.

У сойме гэты факт быў ацэнены, як новы выпад зьдзеку над парлямантам. Дэпутат, ранейшы генэрал, Роя заявіў што сойм таксама ня можа дазволіць зьневажаць сябе і калі сойм не заслугоўвае таго, каб урад з ім лічыўся, дык сойм належыць распусьціць. „Няхай,—заявіў Роя—лепш засноўваецца адкрытая і поўная дыктатура, чымся прыкрытая паўдыктатура.

Не зважаючы на ўсе гэтыя заявы, камісія ўсёткі распачала абмяркоўваць бюджэт без прадстаўніка вайсковага міністэрства.

ЗЬДЗЕКІ НАД ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМІ Ў БЕЛАПАНСКІХ ТУРМАХ.

З „ДОМУ ПАКАРАНЬНЯ" У ДРАГАБЫЧЫ (ПОЛЬШЧА).

Палітзьняволеныя турмы ў Драгабычы, якая носіць афіцыйную назву «Дом пакараньня», выкарыстоўваецца рабочых і сялян Польшчы з заклікам да пасыкі дэлегацый для абсьледаваньня таго агіднага становішча, у якім яны знаходзяцца.

У Драгабычы знаходзіцца 39 палітычных засуджаных да шматгадовай турмы за ўдзел у выступленьнях беспрацоўных у г. Астраўцы, за забойства прававатара ў Тарнопалі, за дэзэртырства з польскай арміі і ўступленьне ў Чырвоную армію ў 1920 г. (сьмяротны прысуд быў заменены 10 гадамі катаржнай турмы) і г. д.

«Дом пакараньня» складаецца з некалькіх корпусаў, у якіх разьмешчаны п'ятары тысячы зьняволеных. Ён пабудаваны па апошняму слову тэхнікі. Агульныя палаты падзелены жалезнымі кратамі на маленькія клетачкі, у якіх на ноч заганяюць зьняволеных.

Турма наведе опца паліцэйскімі і буржуазнымі экскурсантамі, але рабочых туды ня пушчаюць.

Зьдзекі польскага фашызму не абмяжоўваюцца зьняволеньнем разлучэньнем у жалезных клетках, як дзікіх зьвяроў. «Нам дазваляюць бачыцца з нашымі сваякамі ў такіх умовах,—апісуе зьняволеныя,—што наш чалавечы твар не дазваляе нам карыстацца гэтай «ільготай». Вось ужо шмат тыдняў мы ня бачылі сваякоў. Да нас не прапускаюць лістоў. Частыя перакліччі, прыезды ў часе праверкі, грубыя адносіны нагляднчоў—усё гэта хвалюе, упльвае на нервы. Увесь чатыры на вярце, рыхтуючыся да абароны. Гэткага становішча доўга перанасіць нельга».

Тэрор у Заходняй Беларусі.

Ва ўсіх чатырох ваяводзтвах Заходняй Беларусі зноў адбываюцца масавыя арышты. У адным Беластоку арыштавана некалькі дзесяткаў тэкстыльшчыкаў і чыгуначнікаў. У Навагрудзкім і Віленскім ваяводзтвах нібы з прычыны выкрыцьця тэрарыстычнай арганізацыі ў дэфэнзіву кінута больш як 100 рабочых.

За апошнія месяцы ў Заходняй Беларусі слухалася больш 20 палітычных працэсаў: працэс «29» у Вільні, «21»—у Навагрудку, «34» у Вільні, працэсы ў Кобрыне, Пінску і іншых гарадох. У недалёкім будучым новы працэс «46» у Беластоку, які мае назву «Справы ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі», рыхтуецца новы суд над членамі «Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады» і г. д.

Польская фашысцкая юстыцыя ўжывае зараз да рабочых і сялян, прыцягнутых за рэвалюцыйную прапаганду, другую частку 102 артыкулу царскага крымінальнага кодэксу, якая прадугледжвае прыналежнасьць да арганізацыі, якая мае склады зброі. Замест 6-8 год катаргі, суды маюць магчымасьць прысуджваць да 15 год і больш.

Крывавая дэманстрацыя ў Біржах.

«Кур'ер Віл.» (№ 14) паведамляе, што сёньмі днямі ў Біржах адбылася дэманстрацыя безработных, у якой брала ўдзел 500 асоб. Дэманстранты несьлі сьцягі, на якіх былі надпісы: «Дайце нам працу і хлеб». Паліцыя арыштавала некалькіх дэманстрантаў. Тады дэманстранты накінуліся на паліцэйскі вучастак, жадаючы адбіць арыштаваных. Паліцыя стала страляць і забіла аднаго дэманстранта, а 8 параніла.

Арышт камуніста.

„Кур'ер Варш." (№ 14) паведамляе, што паліцыя арыштавала ў Варшаве «камуністычнага арганізатара» Л. Рабіновіча, студэнта права.

Завеі ў Польшчы.

З прычыны вялікіх сьнежных завеяў на Ўсходняй Галіцыі стрымане быў гэтымі днямі чыгуначны рух на многіх лініях львоўскай чыгуначнай дырэкцыі. Між іншым, на новай чыгунцы Луцк—Станіславаў сьнегі спынілі рух двух цягнікоў. Пад Кавлюкамі завея выкарыстала некалькі дзесяткаў тэлеграфных слупоў і сарвала дахі з некалькіх вагонаў.

Польскія эмігранты ў Францыі.

„Пшэгляд" (№ 14) паведамляе, што ад польскіх эмігрантаў-работнікаў сягае 800000. У дэпартаментах Норд і Пад-Кале знаходзіцца 200000 польскіх работнікаў а ў Парыскім дэпартаменце—звыш 10000).

АМЭРЫКА РАТЫФІКАВАЛА ПАКТ КЕЛЁГА.

НЬЮ ЁРК, 15-1. З Вашынгтону паведамляюць, што сэнат Злучаных Штатаў ратыфікаваў Парыскі пакт.

Назначэньне Маргана ў рэпарацыйную камісію экспэртаў.

БЭРЛІН. У нямецкіх палітычных фінансавых колах зрабіла вялічэзнае ўражаньне паведамленьне, што амэрыканскі ўрад мяркуе назначыць сваім прадстаўніком у камісіі экспэртаў па рэпарацыйным пытаньні вядомага банкіра Маргана.

Правы для Новаградзкай Бел. Гімназіі.

«Слово» (№ 12) паведамляе, што віленскі школьны куратурым даў адказ на мэмарыял Беларускай Гімназіі ў Новаградку аб паданьні ёй правоў урадавых гімназій. Куратурым згаджаецца даць наваградзкай гімназіі правы, за выключэньнем права выкладаньня гісторыі Беларусі, што быццам не ўваходзіць у кампетэнцыю куратурыуму.

ФАШЫСЦКАЯ ДЫКТАТУРА Ў ЮГА-СЛАВІІ.

(Ліст з Юга-Славіі).

Галоўным фактарам падзей, якія адбываюцца ў Юга-Славіі, зьяўляецца нацыянальнае пытаньне.

Сэрбская буржуазія грае ў Юга-Славіі такую-ж ролю, якую грала вялікарасейская буржуазія ў царскай Расеі. Бяспраўе нацыянальных меншасьцяў зьяўляецца галоўнай прычынай нацыянальнай розьні, якая абвастраецца з кожным днём. Досыць зазначыць, што ў той час, як у Сэрбіі на кожнага жыхара прыпадае ў сярэднім каля 5 руб. у год простых падаткаў, у Харватыі гэта лічба ўзрастае да 12 руб., у Баводзіне — да 25 руб., а ў Славеніі—да 40 руб. Усе камандныя пасады ў юга-славянскай арміі заняты выключна сэрбамі. У апошні час нацыянальная варожасьць набыла асабліва вострыя формы, якія выявіліся ў забойстве некалькіх харвацкіх дэпутатаў улетку мінулага году і ў выхадзе харвацкай фракцыі з скупшчыны (парлямант).

Падзеі, якія адбыліся ў Юга-Славіі, маюць як надворныя, так і ўнутраныя прычыны.

Перш усяго Юга-Славія павінна адыгрываць буйную ролю ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу, і таму яе гаспадары—англа-французкая антанта—патрабуюць ліквідацыі ўнутранага крызісу. Юга-славянскі ўрад у сучасны момант атрымлівае моцную патрабу ў атрыманьні вялікай пазыкі для ліквідацыі фінансавага крызісу і павялічэньня ўзбраеньняў. Галоўнай умовай для атрыманьня гэткай пазыкі зьяўляецца ўзмацненьне ўнутранага становішча.

Да ўнутраных прычын трэба адносіць той факт, што рух супроць нацыянальнага прыгнечаньня ў апошні час пачаў набываць масавы рэвалюцыйны характар. У нацыянальных вобласьцях асабліва ў Харватыі, гэты рух набывае форму адмаўленьня ад аплаты падаткаў і эканамічнага байкоту рэжыму. У сталіцы Харватыі—Загрэбе—часта адбываюцца масавыя дэманстрацыі.

Апроч таго, у рабоча—сялянскіх масах Харватыі значна ўзмацніўся ўплыў кампартыі, якая прымае актыўны ўдзел у масавым руху і часта адыгрывае ў ім кіруючую ролю.

Рэпускпарляманту (скупшчыны), скасаваньне канстытуцыі і перадача ўсёй улады ў рукі караля азначае адкрытае агалашэньне ваенна-фашысцкай дыктатуры.

Сэрбская буржуазія спрабуе гвалтам задушыць рух нацыянальных меншасьцяў супроць сваіх прыгнятальнікаў. Выданы фашысцкім урадам дэкрэт аб забароне ўсіх рэвалюцыйных арганізацый, а таксама партый, якія грунтуюцца на плямённым і рэлігійным прынцыпах, накіраваны, у першую чаргу, супроць пралетарскіх арганізацый і харвацкай сялянскай партыі Радзіча.

Характэрна, што партыя Прыбычэвіча (аўтаномная дэмакратычная партыя, якая ўваходзіць разам з партыяй Радзіча ў сялянскую дэмакратычную каліцыю і складаецца, галоўным чынам, з сэрбаў, ранейшых аўстра-вэнгерскіх правінцый) не забаронена. Як відаць, ваенна-фашысцкая кліка хоча ўнесьці раскол у харвацкую апазіцыю і перацягнуць Прыбычэвіча на свой бок, каб канчаткова расправіцца з партыяй Радзіча.

Правадыры харвацкай апазіцыі цяпер ужо ня хочуць барацьбы з сэрбскай буржуазіяй і каралеўскай клікай, спадзяючыся дабіцца для сябе некаторай долі ўлады. Буржуазная верхавіна харвацкай апазіцыі—пасьля забойства харвацкіх дэпутатаў у Белградзе ўсімі спосабамі старацца задушыць рэвалюцыйны настрой харвацкіх сялянскіх мас, упарта ўтрымліваючы іх ад рэвалюцыйных дзеяньняў. Судзячы па першых заявах лідэра харвацкай сялянскай партыі Мачэка, які сказаў, што фашысцкі пераварот азначае адмену сэрбскага прыгнятальніцкага цэнтралісцкага рэжыму, і што цяпер харвацкі народ устане на бок караля, можна зрабіць вывад, што правадыры харвацкай апазіцыі рыхтуюць поўную капітуляцыю перад ваенна-фашысцкай клікай.

Зразумела, ваенная дыктатура ніяк ня зможа разьвязаць дзяржаўны крызіс у Юга-Славіі, які мае вельмі глыбокія эканамічныя і палітычныя прычыны. Іменна з прычыны ўзмацненьня дыктатуры, нацыянальны і сялянскі рух будзе яшчэ больш пашырацца і ператварацца ў масавы рэвалюцыйны рух.

Р. Мітровіч.

ДАЛЕЙШАЕ ЗАКАБАЛЕНЬНЕ РУМЫНІІ ФРАНЦЫЯЙ.

ПАРЫЖ, 15-I. Учора прэм'ер Пуанкарэ даў аўдыенцыю румынскаму міністру фінансаў Папавігі, які зараз знаходзіцца ў Парыжы, і ў якасьці прадстаўніка новага румынскага ўраду адна віў перамовы з францускім урадам і з групаю францускіх банкаў аб наданьні Румыніі пазыкі для стабілізацыі валюты. Водлуг паведамленьняў газэт, пазыка будзе забясьпечана галоўнымі прыбытковымі паступленьнямі румынскага бюджэту.

У Саюзе ССР.

ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ НА ІДЭАЛЁГІЧНЫМ ФРОНЦЕ.

Выступленьне т. Яраслаўскага на баўманаўскай райпартканфэрэнцыі.

МАСКВА, 15-1. Цэнтральным месцам пасяджэньня баўманаўскае райпартканфэрэнцыі 15-га студзеня было выступленьне т. Яраслаўскага. Прамоўца спыніўся на шэрагу недахопаў і ідэалёгічнае працы партыі. На гэтым фронце мы вядзём барацьбу з шматлікімі ворагамі т. зн. кістамі, сэктантамі і правымі групамі. Тав. Яраслаўскі на шмат-якіх прыкладах паказвае, як мы часам былі мала падрыхтаваны для гэтае барацьбы, не давалі патрэбнага адпору. Як на прыклад слабасьці падрыхтоўкі з нашага боку т. Яраслаўскі зазначыў на калугаворную кампанію.

Спыняючыся на барацьбе з трацкізмам, ён кажа: гэты фронт мы выкрылі, але паспаляць барацьбу з трацкізмам нельга. Да трацкістаў ідуць ранейшыя партыйныя людзі, скарочаныя, а іншы раз і моладзь, бачачы ў іх нешта гераічнае. Мы павінны паказаць, што трацкізм дакаціўся да форменнае контр-рэвалюцыі, і дапамагчы неспакушаным вырвацца з-пад яго ўплыву. Трэба сказаць,—казаў далей Яраслаўскі,—што розныя прымірэнчыя адносіны да правага ўхілу харчуюць трацкізм.

Зазначыўшы на патрэбу энэргічнае барацьбы з правымі, Яраслаўскі перайшоў да пытаньня аб уплыве царкоўнікаў і сэктантаў. Тут Яраслаўскі ніяк іншым, зьвярнуў увагу канфэрэнцыі на такое агіднае зьявішча, як перадача ганцлёвых і іншых у канчатковым выніку прыгодных пад жыльле будынкаў пад рэлігійныя дамы.

У канцы свайго выступленьня т. Яраслаўскі зазначыў на недастатковасьць пралетараких кадраў у нашых партыйных арганізацыях, адсталасьць нашых радавых мас, а гэта ставіць пад пагрозу выкананьне лістападаўскае рэзалюцыі аб складзе партыі.

МАЦНЕЕ САВЕЦКА-НЯМЕЦКАЯ НАВУКОВАЯ СУВЯЗЬ.

ЗАЯВА ПРАФ. МЮЛЬЛЕРА ПРАДСТАЎНІКУ ТАСС.

МАСКВА, 15-1. Перад выездам у Бэрлін старшыня нямецкае вучонае дэлегацыі п. аф. Мюльлер заявіў у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС наступнае: «Мы пакідаем СССР з пачуцьцём глыбокага задаволеньня. Нам быў зроблен самы шчыры прыём як з боку савецкага ўраду, так і з боку грамадзкіх і навуковых арганізацый Масквы. Нас зьдзівілі разьмеры тае навуковае працы ва ўсіх галінах ведаў, якая вядзецца ў вышэйшых школах, інстытутах і лябараторыях вашага краю. Навукова-дасьледчыя інстытуты, якія мы наведвалі, з вялікім посьпехам працуюць над шэрагам практычных пытаньняў, высоўваемых прамысловасьцю і наогул усёю народнаю гаспадаркаю краю. У Маскве мы заснавалі шчыльную сувязь, якая, як мы спадзяёмся, разгорнецца ў далейшым у яшчэ больш прыяцельскія зносіны з узаемнай карысьцю для СССР і Нямеччыны».

Памёр праф. Навіцкі. —

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ВАЙСКОВЫ САВЕТ СССР ХАДАЙНІЧАЕ АБ НАЗНАЧЭНЬНІ ПЭНСІІ СЯМ'І ТАВ. НАВІЦКАГА.

МАСКВА. Пасьля нядоўгае хваробы памёр заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі прафэсар Вайсковае Акадэміі Рабоча Сялянскае Чырвонае арміі імя Фрунзэ т. Навіцкі. У сакавіку 1917 году пасьля лютаўскае рэвалюцыі Навіцкі быў на начале памочнікам вайсковага міністра. Пасьля Кастрычніцкае рэвалюцыі 23-га лістапада 1917 г. ён быў назначан галоўнакамандуючым паўночнага фронту і флёту Балтыцкага мора, а ў 1918 г.—прафэсарам Акадэміі Генэральнага штабу Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі і вайсковым кіраўніком вышэйшае вайсковае інспэкцыі. У 1922 г. удзельнічаў у Генуэзкай канфэрэнцыі ў якасьці экспэрта.

Рэвалюцыйны Вайсковы Савет СССР бярэ пахаваньне на кошт ваенведу і ўзьнімае перад урадам хадайніцтва аб назначэньні пэнсіі для яго сям'і.

Тав. Варашылаў зьвярнуўся да сястры нябожчыка з лістом, у якім ад імя Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету Саюзу ССР выказвае пачуцьцё шчырага жалю з прычыны сьмерці Навіцкага. «Васіль Хведаравіч,—зазначана ў лісьце,—быў агульнапрызнаным ваенным аўтарытэтам у шэрагах Чырвонай арміі. Ён прышоў адным з першых ваенных спэцыялістаў у шэрагі Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі».

УСЕСАЮЗНЫ ПАХОД КАМСАМОЛУ ЗА ЎРАДЖАЙ.

МАСКВА. ЦК УсеЛКСМ зьвярнуўся да ўсіх арганізацый камсамолу з лістом, у якім зазначана, што 15-га лютага камсамол павінен выступіць ва «усесаюзны паход за ўраджай», які працягнецца да асеньняга сьвята ўраджаю. Камсамол у часе паходу наладзіць шырокую прапаганду і барацьбу за чыстагатунковае насеньне, за раньняе ворыва поля, за пашырэньне засеўнага абшару, за поўнае выкарыстаньне машын і за калектыўнае правядзеньне ўсіх мерапрыёмстваў, якія даюць павялічэньне ўраджаю.

Суд над сям'ёю афэрыстаў.

АРАНБУРГ, 15-1. Распачаўся суд над сям'ёю афэрыстаў Каўбаноўскіх, якія выдавалі сябе за дактароў.

На лаўцы падсудных Сяргей Каўбаноўскі. Пасьля Кастрычніцкавае рэвалюцыі ён у 1922 годзе пачаў выдаваць сябе за члена партыі (са стажам 1904 году). Яму ўдалося дамагчыся на пасаду старшыні Стаўропальскага Рэвалюцыйнага Трыбуналу. На гэтай пасадзе ён учыніў шмат злачынстваў, за што ў 1923 годзе быў асуджан да растрэлу з заменаю 10-цігаловым зьняволеньнем у астрозе. У верасьні 1924 г. (праз год) ён быў вызвален з прычыны хваробы печані.

Апрача Сяргея Каўбаноўскага да суду прыцягнуты яго брат Барыс. У 1925 годзе ён паступіў у выдавецтва «Бязбожнік», дзе атрымліваў пэнсію ў 700 руб. у месяц. У выдавецтве ён учыніў шмат пакраж і падпалаў, а пасьля таго, як яго выкрылі, уцёк.

На лаўцы падсудных, апрача братоў Каўбаноўскіх, таксама жонка Барыса, Разалія Каўбаноўская. Усе падсудныя ня маюць ніякае мэдыцынскае адукацыі. Аднак, яны выдавалі сябе за дактароў, займалі адказныя пасады і ўчынялі шмат растрат і падробак.

Ліст УЦСПС да прафарганізацый.

МАСКВА. 15-1. Учора УЦСПС разаслаў прафсаюзным арганізацыям ліст у якім прапануе пасьля скончаньня калугаворнае кампаніі арганізаваць шырокую растлумачваючую працу аб умовах падзеньня калектыўных угаворай і аб чарговых задачах на поднае гаспадарцы.

Прафсаюзы павінны бязупынна растлумачваць рабочым масам,—гаворыцца ў ліцьце,—што толькі пры напружаньні ўсіх рэсурсаў прамысловасьці, значным палепшаньні якасьці працы гаспадарчых органаў, актыўным удзеле прафсаюзаў і рабочае масы ў справе рэканструкцыі прамысловасьці, значным палепшаньні прадукцыйнасьці працы і працэўнае дысцыпліны,—удасца закавакь узяты тэмп індустрыялізацыі краю і забясьпечыць далейшае бязупыннае палепшаньне матар'яльнага становішча рабочае клясы.

Першы мэталёзавод на 7-мігадз. дзень.

ЛЕНІНГРАД, 15-I. 16-га студзеня пераходзіць на 7-мігадзінны працоўны дзень мэталёзавод «Пнэўматык». Праца будзе весьціся ад 8 гадзін раніцы да 3 з паловаю гадзін дню, з поўгадзінным перапынкам.

Сёньня пасьля працы на заводзе адбыўся сход рабочых.

Завод «Пнэўматык» зьяўляецца першым у Ленінградзе мэталёзаводам, які пераходзіць на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Першы заказ на траўлеры заводам Ленінграду.

ЛЕНІНГРАД. Кіраўніцтва паўночнага дзяржаўнага рыбнага трэсту перадае ленінградзкім суднабудаўнічым заводам першы заказ на 12 марскіх траўлераў для працы на рыбалоўных промыслах у Лёдавітым акіяне. Пабудова гэтых траўлераў будзе каштаваць больш 8-мі міліёнаў рублёў.

Да гэтага часу траўлеры заказваліся ў Нямеччыне.

Далучэньне зямлі Франца Іосіфа да Архангельскае губ.

МАСКВА, 14-1. Прэзыдыум Усерасейскага ЦВК перадаў на зацьвярджэньне саюзнага ўраду сваю пастанову аб далучэньні групы выспаў пад назвою «Зямля Франца Іосіфа» да Архангельскае губерні. Група гэтых выспаў знаходзіцца ў межах Паўночнага Ледавага акіяну па лініі разьмяшчэньня абшараў Архангельскае губ.

Індустрыялізацыя, рэканструкцыя сельскай гаспадаркі і сацыялістычны наступ.

(ДА ПЯТАЙ ГАДАВІНЫ СЬМЕРЦІ ЛЕНІНА).

Генеральная ленінская лінія, якую праводзіць партыя, складаецца з таго, каб на аснове росту вытворчых сіл забяспечыць апераджаючы рост сацыялістычных элементаў гаспадаркі над капіталістычным.

У. І. Ленін у сваіх апошніх перад сьмерцю артыкулах—«Аб кааперацыі» і «Лепш менш, ды лепш»—намеціў шырокую праграму і шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Які гэты шлях? Пры захаванні правільнай палітыкі пралетарскай дыяржавы, пры ўзмацненьні кіраўніцтва з боку пралетарыяту селянствам, пры заваяванні давер'я селянства да пралетарскай дыктатуры асноўны шлях сацыялістычнага будаўніцтва—гэта індустрыялізацыя.

«Усякае найменшае зьбяражэньне затаваць для нашай буйнай прамысловасьці»—дае дырэктыву Ленін. Партыя, выконваючы гэту дырэктыву, на апошнім лістападаўскім пленуме выразна растлумачыла, якое значэньне мае індустрыялізацыя ў нашай краіне, „зрэйнаваной селянскай краіне", гаворачы словамі Леніна. Індустрыялізацыя—гаворыцца ў рэзалюцыі пленуму—дае магчымасьць рабіць рэвалюцыянізуючы ўплыў як на тэхніку сельска-гаспадарчай вытворчасьці, так і на рэканструкцыю сацыяльных адносін у вёсцы.

Толькі ў рашучым і цьвёрдым правядзеньні палітыкі індустрыялізацыі, партыя, верная заветам Леніну, бачыць паруку адхіленьня ўсякай магчымасьці звароту капіталізму. Забыць аб гэтай магчымасьці, выпусьціць з-пад увагі сувязь паміж п авадзімым партыйным курсам на індустрыялізацыю краіны і неабходнасьцю выкарчаваньня самых каранёў капіталізму, якія жывуць дзякуючы дробнатаварнай гаспадарцы, значыць адмовіцца ад камунізму.

Вось што казаў Ленін адносна гэтага: «Пакуль мы жывём у дробнабуржуазнай краіне, для капіталізму ў Расеі ёсьць больш моцная эканамічная база, чымся для камунізму. Гэта неабходна памятаць. Кожны, хто ўважліва назіраў за жыцьцём вёскі, у параўнаньні з жыцьцём гораду, ведае, што мы карэньняў капіталізму ня вырвалі і фундамант, аснову ў унутранага ворага, не падарвалі. Апошні трымаецца на дробнай гаспадарцы, і, каб падарваць яго, ёсьць адзін спосаб — перавесьці гаспадарку краіны, у тым ліку і земляробства, на новую тэхнічную базу, на тэхнічную базу сучаснае буйнае вытворчасьці».

Перавесьці земляробства на новую тэхнічную базу—значыць правесьці рэканструкцыю сельскае гаспадаркі. Але рэканструкцыя сельскае гаспадаркі, як зазначаў Ленін, ня можа быць нейкай самастойнай задачай, выраблянай без залежваньці ад рэканструкцыйных працэсаў нашае народнае гаспадаркі ўцэлым. Павышэньне ўраджайнасьці і якасьці сельска-гаспадарчае прадукцыі, патаньненьне гатае прадукцыі, індустрыялізацыя сельскае гаспадаркі і наогул усе мерапрыёмствы, якія вядуць да культурнае перабудовы сельскае гаспадаркі як у сэнсе тэхнікі, так і ў сэнсе сацыяльнае арганізацыі—самым шчыльным чынам залежаць ад машынізацыі і электрыфікацыі, ад уж ваньня мінеральных угнаеньняў, ад меліяраціі і інш. А гэты шлях раней усяго і больш усяго прадугледжвае апераджаючы рост і разьвіцьцё нашае прамысловасьці і, у першую чаргу, цяжкай прамысловасьці. Кажучы іншымі словамі, прадугледжвае індустрыялізацыю краіны.

Такім чынам, згодна ленінізму, галоўная задача на шляхох сацыялістычнага наступу—гэта арганізацыя буйнае машыннае індустрыі, як базы сацыялізму.

Другая важнейшая задача наступу—гэта пагалоўнае кааперараваньне сялянства, калектывізацыя яго пад кіраўніцтвам узрастаючай сацыялістычнай прамысловасьці.

У. І. Ленін да сваей сьмерці здолеў з посьпехам правесьці арганізаванае аступленьне пралетарскае армії, забясьпечыў ёй перапынак, зьбіраньне сіл і перабудову шэрагаў для наступу. Ён намеціў праграму і шляхі гэтага наступу. Але яму ня прышлося дажыць да значных посьпехаў на гэтым шляху. Толькі прыкладна з 1924-25 году, ужо бяз Леніна, партыя пачынае наступ на фронце гаспадарчага будаўніцтва, якое з кожным годам праводзіцца ўсё больш узмоцненым тэмпам.

Само сабою зразумела, як гэта і прадбачыў У. І. Ленін, тэхнічны і сацыяльна-эканамічны наступ на кулацка-мэшманаўскія формы гаспадаркі выклікае адпор з боку кулака і мэшмана і абвастрае клясавую барацьбу. Дыктатура пралетарыяту ў пераходны перыяд згодна ленінізму, толькі асобная форма клясавае барацьбы, накіраваная на выцясьненьне гараджое і сельскае буржуазеі. Гэтая барацьба ўскладняе будаўніцтва, вараджае цяжкасьці. Але гэтыя цяжкасьці ня могуць напалохаць партыю і рабочую клясу, выконваючы праграмай і тактыкай ленінізму. Пралетарыят, пад кіраўніцтвам партыі, вядзе свой наступ, абапіраючыся на ленінскі плян—на індустрыялізацыю, на бязупынна ўзрастаючую аграмаджаную гаспадарку нашае краіны. І хоць цяжкасьці яшчэ вельмі вялікія, але ўжо цяпер выразна выяўляюцца ўсе перавагі тае невядомае капіталізму сыстэмы плянавае гаспадаркі і кіраўніцтва, якая ня толькі ў агульным, але часткова і ў дэталях была геніяльна прадказана У. І. Леніным.

РАБОЧЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ АБУРЭЧЬНЯ

У ЗЬВЯЗКУ З ЗАБОЙСТВАМ ТАВ. ХУЛІО МЭЛЬЛЯ.

МЭКСІКА, 15-1. У зьвязку з забойствам Хуліо Мэльля па ўсёй Мэксіцы адбываюцца масавыя дэманстрацыі пратэсту. У Вэра-Круце рабочыя і студэнты дэманстравалі перад будынкамі консульстваў Кубы і Злучаных Штатаў. Абодвы будынкі замкнуты і вартуюцца паліцыяй. У Мантарэі рабочыя ў часе дэманстрацыі сьпявалі Інтэрнацыянал; з шэрагаў дэманстрантаў праз увесь час чуліся выгукі «Прэч імпэрыялізм янкі». Прэзыдэнт Пэртэо Хіль аддаў загад уважліва расьсьледаваць справу Мэльля; адначасна ўрад дазволіў „Лізе ўціскаемых рабочых", сэкратаром якое быў Мэльля, і Мопр'у наладзіць самастойнае расьсьледаваньне.

Дадатковыя парляманцкія выбары ў Эльзасе.

ПАРЫЖ, 14-1. Агенцтва Гаваса паведамляе: «У Алькірсе і Кольмары (Эльзас) адбываліся дадатковыя выбары дэпутатаў. На агульных парляманцкіх выбарах у гэтых округах былі абраны эльзаскія аўтанамісты Рыклен і Россе, але абраньне іх было прызнана палатаю дэпутатаў неправамоцным на той падставе, што яны былі засуджаны на кольмарскім працэсе аўтанамістаў.

У Алькірсе замест Рыклена абраны аўтанаміст Штурмэль; у Кольмары будзе пераабраньне, бо ніхто не атрымаў абсалютнае большасьці галасоў; адносную большасьць галасоў мае аўтанаміст Гаус.

Другі паплавок ад „Латама"(?)

ОСЛО 9-1. Н р ючае тэлеграфнае агенцтва з ведамляе: „На захад ад Норд-Капа ў акрузе Хінмаркен да ўзьбярэжжа прыплыў паплавок з надпісам „Латам—Парыж".

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Пры ўзросшай актыўнасьці.

(Рагачэўскі р н, Бабруйскай акругі).

Перавыбары Азяранскага сельсавету яшчэ лішні раз паказалі, што блёк бедняка з серадняком замацован, як належыць, што ў сваю чаргу сьведчыць аб дастатковай рабоце сярод беднаты і серадняцтва.

Актыўнасьць выбаршчыкаў настолькі ўзрасла, што ў вёсцы Радамысль была амаль што стопроцантная яўка абіральнікаў гэтага вучастку, кандыдатуры, выстаўленыя беднатой прашлі аднагалосна.

Вёска Азяраны была разьбіта на два вучасткі, дзе ў адным сход перавыбараў таксама прайшоў вельмі ўдала, амаль што кожны абіральнік быў актыўным дзеячом, імкнучыся ўсебакова падыйсьці да выбараў і калі прайшлі 4 партыйцы, лясьнічы настаўнік і інш., дык гэта гаворыць аб актыўнасьці і клясавым падыходзе абіральнікаў да гэтага пытаньня.

Жанчына таксама не забыта; іх абрана ў склад сельсавету 2. Па іншых вучастках выбары прайшлі таксама здавальняюча. 8 га студзеня адбылося арганізацыйнае пасяджэньне, якое абрала старшынёю партыйца і абрала добраякаснае кіраўніцтва, якое і будзе накіроўваць працу савету на ўздым сельскай гаспадаркі.

Я. Крушына.

Рабочыя брыгады на перавыбарах.

БАРЫСАЎ, 16 1. Рабочыя брыгады барысаўскіх заводаў і фабрык аказалі значную дапамогу ў правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

Па сямі сельсаветах працавала ўсяго 25 чалавек. Рабочыя, з фактамі і лічбамі ў руках, разьбівалі выступленьні кулацкай часткі вёскі на тэму—«Рабочым лепш жывецца, чым сялянству».

Дзе дзелі'ся аграномы?

(Вёска Ліцьвінава, Ляднянскага райёну, Аршанчына).

Мы скардзімся, што кепскі ўраджай бывае. Але каб яго павялічыць, большасьць вас, сялян, ніякіх аграномічных парад, праверaных на практыцы, ня маем. З гэтае прычыны выходзіць такі вынік, што: „а мо' бог дапаможа".

Але бываюць хібы і з боку аграномі. Прыкладам можа паслужыць тое, што неваўсёды аграномы зьвяртаюць увагу на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі.

У нашай вёсцы Ліцьвінава ў 1925 годзе працаваў с.-г. гурток пад кіраўніцтвам агранома Горацкай С.-Г. Акадэміі. Заняткі сялянамі наведваліся добра: з 40 гаспадароў на занятках прысутнічала да 30, з якіх былі і жанчыны. На занятках разглядаліся пытаньні па сельскай гаспадарцы: карысьць шматпольля, пасеў карняплодаў і кармавых траў, угнаеньне глебы штучнымі ўгнаеньнямі і г. д.

Па сканчэньні курсаў аграномам былі раданы сялянам квіткі; з боку сялян была выказана падзяка аграному і запрашэньне на наступны год прыехаць зноў.

Вынікам працы гуртка было тое, што 9 сялян падалі заявы на пераход з трохполкі па шматпольле. Летам 1926 г. прыехаў аграном і 13 гаспадарак разьбіў на шматпольле. На гэтым і скончылася. Аграномы вінаватага разу не наведалі нашу вёску. Тыя гаспадары, якія разьбілі сваю пахаць на шматпольле, без дапамогі агранома не перайшлі на сапраўднае шматпольле — працуюць па-старымцы.

Я думаю, што райза патрэбна паклапаціцца аб тым, каб назіраваць агранома ў нашу вёску на дапамогу сялянам.

В. Цэлікаў.

Насеннаачышчальная кампанія яшчэ не раскачана.

Гомель 16-1. Насеннаачышчальная кампанія ў акрузе праходзіць слаба. Асобныя райёны па прыкладу мінулых год мяркуюць распачаць гэтую кампанію ў лютым месяцы. У сучасны момант насеннаачышчальныя абозы на мясцох не скарыстоўваюцца.

У зьвязку з гэтым ёсьць небясьпека, што плян на 100 проц. паачыстцы насеньня ня будзе выканан.

У Гомельскім райёне на 12 студзеня абозам ачышчана толькі 2706 пуд. зярна. Кааперацыйныя курсы ў райёнах яшчэ не распачалі сваю працу. Палессельсаюз дагэтуль яшчэ ня выплаціў 1500 руб. на арганізацыю гэтых курсаў.

Акрземаддзел прапанаваў райёнам узмацніць сваю ўвагу да зерноачышчальнай кампаніі і да поўнага правядзеньня плану насеннай пасеўнай кампаніі.

Ніводнага фунта прыватніку.

Старшынёй Жлобінскага сельсавету кред. т-ва нядаўна быў праведзен агульны сход грамадзян в. Антонаўка, Майскага сельсавету, на якім ста ла пытаньне аб калектыўнай здачы ў кааперацыю зьлішак хлеба. Праўда, вёска сама па сабе мае 90 двароў, бядняцкага насельніцтва—большасьць.

Сяльне адзінадушна ўхвалілі ня даць прыватніку ніводнага фунта збожжа. Увесь хлеб—кааперацыі.

Сялянская пастанова на паперы не засталася. Назаўтра хто колькі мог — сабралі 80 пудоў аўса і адвезьлі ў сельска-гаспадарчую кааперацыю. У гэты самы дзень сяляне зрабілі ўмову з кааперацыяй, каб мець паросістага кныра. Вясной думаюць калектыўна набыць сельска-гаспадарчыя машыны.

Акінчыц.

Бабруйшчына.

Паступленьне с.-г. падатку ўзмацнілася.

Гомель, 15-1. У акрузе паступленьне сельска-гаспадарчага падатку ўзмацнілася. Процант выкананьня складае 75 проц. Па асобных райёнах, галоўным чынам, Камарынскі, Хойніцкі, перавыдадзі 100 проц. выкананьня.

Слаба паступае сельска-гаспадарчы падатак у Гомельскім і Рэчыцкім райёнах. Узмацненьню збору падаткаў дапамагае раскачка, утвораная рабочымі брыгадамі ў селішчах акругі.

Асобныя сходы жанчын.

Смалявічы, 16-1. Для практыкі ў вёсках—Забалоцьці, Судабоўка і Мікалаевічах былі праведзены асобныя сходы жанчын. Вынікі надта добрыя. Процант прысутнічаючых павялічыўся да 70.

Жанчыны на сваіх сходах здчуваюць сябе свабоднымі, вольнымі. Працу сельсавету брытыкуюць нават актыўней і сур'ёзней за мужчын.

На трох сходах жанчыны, быццам змовіўшыся, выступалі супроць продажы гарэлкі і за ўзмацненьне барацьбы з самагонакурэньнем.

Яшчэ два калгасы.

(В. Нізгалава, Вульскага р., Полацкай акр.).

Вёска Нізгалава, Вульскага райёну заўсёды лічылася адназ з першых. Сельска-гаспадарчы падатак плаціць першая, таксама прымае самаабкладаньне і іншае.

І вось парашылі нізгалаўцы перайсьці на калектыўную працу. Больш карысьці будзе,—кажуць яны. Аб'ядналася бядняцка-серадняцкая частка вёскі і арганізаваліся два калгасы на сваей індзельнай зямлі. Адзін калгас складаецца з 20 гаспадарак, а другі з 16.

І тут яны на першым мейсцы!

Анучын.

Падрыхтоўка да тыражу распачалася.

МАГІЛЕЎ, 11 1. Трэці райённасэрыйны тыраж пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі па сэрых 11 і 48 адбудзецца з 7 па 14 лютага ў г. г. Клімавічах і Магілеве.

У Клімавічы прыбыла з Гомелю тыражная машына.

Афіцыйныя табліцы выйгрышаў будуць зьмешчаны у газэце «Магілеўскі Селянін».

Распачалася падрыхтоўка да тыражу.

Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону пад пагрозай зрыву.

Гомель, 15-1. Аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону шмат гаварылася і пісалася. Аднак, на сёньнешні дзень знаходзімся пад пагрозай зрыву своечасовага пачатку будаўнічага сэзону.

Да гэтага часу будаўнічыя пляны не пагоджаны, будаўнічыя арганізацыі ня ведаюць фінансавых плянаў. Кепска стаіць справа в прымацаваньнем рабочае сілы.

Будаўнічыя арганізацыі не займаюцца пытаньнем падрыхтоўкі кватэр для прыежджых рабочых. Калі ня будзе узмоцнена ўвага да падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону, дык і ў гатым годзе будаўніцтва ў акрузе распачнецца з вялікім спазьненьнем і штогодныя недахопы будуць паўторыцца.

Ашчадная справа на Бабруйшчыне.

Бабруйск, 11-1. На першае студзеня 1929 году па Бабруйшчыне налічваецца 62 існуючыя касы ашчадкасы.

Касы гэтыя аб'ядноваюць навокал сябе 12.387 укладчыкаў з агульным капіталам у 614 тысяч рублёў.

Такім чынам рост укладчыкаў супроць мінулага году дасягае 209 проц., а рост укладаў—178 проц.

За зьнішчэньне „рускай горкай".

БАРЫСАЎ, 16-1. Па ўсіх вёсках Жыцькаўскага сельсавету сяляне па сваёй ініцыятыве забаўлялі да наказу новым дэпутатам такія пункты:

Узяць курс на зачыненьне гарэлачных крам, робячы гэта паступовым парадкам.

Узмацніць барацьбу з хуліганствам, так як гэта зьявішча падрывае ўсе культурныя пачынаньні і шкодзіць нашай гаспадарцы.

Лес пад пагрозай зьнішчэньня.

Барысаў, 11 1. Лес мясцовага значэньня, які прыналежыць да вёскі Студзенка, Бытчанскага с.-с. паволь на зьнішчаецца сялянамі.

Нядаўна намячалася зьмена лясных вартаўнікоў, але ніхто ня хоча заставацца на гэтых пасадах, бо ніхто ня хоча браць гэтыя парубкі на сваю шыю.

ЗА ЧЫСТАТУ ЛЕНІНСКІХ ШЭРАГАЎ

Узмацнім шэрагі ленінскае партыі.

Давесьці рабочую клясу да перамогі Кастрычніканае рэвалюцыі нашая партыя магла толькі таму, што яна была рэвалюцыйнай партыяй рабочае клясы. Яна аб'ядная ў сваіх шэрагах лепшыя сілы, якія высунуў пралетарыят у барацьбе з царызмам і капіталізмам і выхавала з іх вяўніручых барацьбітоў, таму, што наша партыя на чале з Уладзімірам Ільлічом, вяла рашучую барацьбу з оппанамістамі, меншавікамі, адзавістымі і ўсімі, хто спрабаваў схіліць пралетарыят з шляху паступовае, рэвалюцыйнае клясавае барацьбы.

Пасьля разгрому контррэвалюцыі ў нашу партыю хлынулі сотні тысяч новых людзей з непралетарскіх пластоў інтэлігенцыі, мяшчанскіх элементаў і элементаў авантурыстычнага укладу, якія імкнуліся прымазацца да партыі, якая знаходзіцца ва ўладзе, з надзеяй выкарыстаць сваё становішча ў асабістых інтарэсах.

Чыстка 1921 г. і праверка савецкіх ячэек 1924 году не маглі цалкам ачысьціць партыю ад прымазаных да яе і чужых элементаў. Хваля самаплыўкі, якая ахапіла зараз самыя шырокія рабочыя масы, выкрыла шмат недахопаў у нашай вытворчасьці і ў дзяржаўным апараце, выкрыла ня мала бруду і разлажэньня сярод членаў камуністычнае партыі.

Факты разлажэньня і бюракратычных адносін да справы, нячуласьці да інтарэсаў рабочых і сялянскіх мас у шмат якіх выпадках пачалі прыпыняць рост нашае партыі, затрымліваць прыліў у яе лепшай часткі пралетарыяту на заводах і прадпрыёмствах. Пачала выпадкаў, калі пасьля праведзенае пры ўдзеле рабочых праверкі ненарматыва ідучае праць та ці іншага прадпрыёмства, і пасьля выключэньня бюракратаў і разложаных чыноўнікаў і кіраўнікоў, рост партыі ў гэтых установах і прадпрыёмствах хутка падымаецца, асабовы склад чыноў партыі падвойвае ца.

Сьмерць Уладзіміра Ільліча ўцягнула ў нашыя шэрагі сотні тысяч рабочых з варштату, якія ішлі ў партыю барыніць заветы Леніна.

Да 10 й гадавіны Кастрычніканае рэвалюцыі мы бачылі новы прыліў сіл рабочае клясы ў шэрагі нашае партыі. Але гэтага мала.

Расьце прамысловасьць, расьцё рабочая класа, і справа ўцягненьня рабочых у нашу партыю павінна ажыцьцяўляцца штодзённа. Індустрыялізацыя краю, рацыяналізацыя вытворчасьці не магчымы без уцягненьня ў гэту справу самых шырокіх рабочых мас. Чымбольш мы ўцягваем рабочых непасрэдна ў будаўніцтва, у кіраўніцтва будаўніцтвам, чымся больш за прымаюць удзел у крытыцы недахопаў нашае працы і ў выяўленьні магчымасьці зьвяшчыць гэтыя недахопы тым больш рабочы разумее значэньне партыі і пераконваецца ў неабходнасьці ўступіць у яе шэрагі. І тут кожны камуніст, дыскрэдытуючы сваю партыю, зьяўляецца перашкодай для ўступленьня рабочых у шэрагі нашае партыі.

Чыстка партыі павінна змыць гэты бруд, які прысасываецца да партыі, каб выкарыстаць яе ў сваіх асабовых інтарэсах.

П.

Ачысьцім шэрагі партыі ад варожых элемэнтаў.

На ўсіх этапах барацьбы за перамогу сацыялізму, на ўсіх шматлікіх фронтах сацыялістычнай рэвалюцыі камуністычная партыя ішла і ідзе ў першых шэрагах рабочае клясы. Інакш і быць ня можа.

Спраўляючыся з цяжкасьцямі і найскладанейшымі задачамі, упягваючы мільёны новых барацьбітоў і актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва, партыя заўсёды клапацілася і будзе клапаціцца як аб чыстаце ідэйвай зброі—правільнай сапраўды марксыстска-ленінскай палітыкі,—так і аб чыстаце, моцы і цьвёрдасьці сваіх шэрагаў.

Узмацняючы партыю за кошт лепшых, найбольш сьвядомых і пэўных, адданых спраце рабочай клясы пралетарыяту, рабочых з вытворчасьці, партыя адначасова прымае і будзе прымаць усе меры да таго, каб ахіліць усе існуючыя недахопы, выправіць усе памылкі, якія затрымліваюць і перашкаджаюць нашаму руху наперад.

Зразумела, што клясава-варожыя пралетарыяту, ідэйва варожыя бальшавізму, прымазаўшыяся да партыі, падпаўшыя распаду і перароджаныя элементы сваёй дзейнасьцю дыскрэдытуюць партыю, перашкаджаюць ёй працаваць.

Вось чаму лістападаўскі пленум ЦК поруч з асабліваю ўцягваньня ў партыю лепшых перадавых рабочых ад вытворчасьці прызнаў таксама неабходным зрабіць ачыстку партыі ад варожых, распаўшыхся элементаў.

За апошнія гады ў партыю ўвайшло звыш 700 тыс. рабочых (з часу ленінскага прызыву), бліжэйшыя два гады далуць новы рост партыі за кошт перадавых, цьвёрдых і вытрыманых сьвядомых рабочых з вытворчасьці. Бязумоўна, што задача, пастаўленая пленумам ЦК, задача, выраблеваньне якой азначае ўцягненьне ў кацы 1930 г. у партыю 300-350 тысяч рабочых з вытворчасьці, яшчэ больш узмоцніць шэрагі партыі. Але ў цэлым задача будзе вырашана калі ўсе прымазаўшыяся, адарваныя ад масы, перароджаныя элементы своечасова будуць выключаны з яе. Рэзалюцыя лістападаўскага пленуму пагатаму гаворыць, што—«Праверка і чыстка арганізацый ад варожых элементаў, распаўшыхся, бюракратаў і г. д. павінна праводзіцца больш рашуча і больш сыстэматычна».

Адносна партыйных арганізацый вёскі, пленум зазначыў, што ў іх „зусім незначная ўдзельная вага пралетарскіх элементаў і зусім мізэрны кадр калгаснікаў" і што ў некаторых выпадках у складзе вясковых арганізацый значнае доля заможных сялян. Сярод гэтых элементаў маюцца так зв. якія зусім адарваліся ад партыі, зблізіліся з кулаком, гаспадарча абрасьлі, распаліся і нічога агульнага з пралетарыятам і яго партыяй ня маюць.

Гаворачы аб гэтых элементах у сваім дакладзе аб выніках лістападаўскага пленуму ЦК на сходзе маскоўскага партактыву, тав. Молатаў зазначыў, што пры правядзеньні хлебазагатоўчай кампаніі ў мінулым годзе назіраліся факты, калі некаторыя адарваныя ад партыі, распаўшыяся камуністы, ня толькі ня выявілі неабходнай актыўнасьці ў справе правядзеньня хлебазагатовак, але і шкодзілі ім, адкрыта выказвалі сваё нежаданьне дапамагчы ў выраўненьні важнейшых задач хлебазагатоўчай кампаніі. Некалькі сотняў вясковых камуністаў у сувязі з гэтым былі выключаны з партыі.

Зразумела, што гэтыя, прыросшыя да кулацтва элементы, на могуць заставацца ў партыі. Гэтыя людзі зблізіваюцца з клясавым ворагам і наўмысьля скажаюць лінію партыі, бо клясавы вораг зацікаўлен у тым, каб рэвалюцыйная лінія скажалася, бо правільнае правядзеньне лініі партыі, якая абапіраецца на бедняка і захоўвае саюз з серадняком, бье па кулаку і яго інтарэсах. Патрэбна пагатаку карэнная чыстка вясковых арганізацый, патрэбна больш сыстэматычная праверка і чыстка арганізацый ад варожых, бюракратычных і распаўшыхся элементаў.

Паляпшаючы працу ўсіх бяз выключэньня арганізацый і рабочай клясы, асабліва, масавых арганізацый—саветаў, прафсаюзаў і г. д., разгортваючы пралетарскую дэмакратыю ва ўсіх гэтых арганізацыях, разгортваючы самакрытыку, рашуча змагаючыся з бюракратызмам, партыя, убіраючы ў сябе лепшых рабочых з вытворчасьці, ачысьціць свае шэрагі ад усіх варожых перароджаных элементаў.

А. Р.

РУМЫНІЯ ПАСЬЛЯ ВЫБАРАЎ.

(Артыкул члена ЦК Румынскай кампартыі т. Бадулеску).

У сьнежні мінулага году ў Румыніі двоў адбываліся парляманцкія выбары. 3 лютага 1926 году парлямант пераабіраецца ў Румыніі ўжо трэці раз. Гэта—паказальнік «стабілізацыі» румынскага капіталізму ў дзесяты год існаваньня «вялікай Румыніі», але ні ў якім выпадку ня довад палітычнай «дэмакратызацыі» краіны, як спрабуюць паказаць справу сацыял-дэмакраты.

Выбары, што нядаўна адбыліся, скончыліся, як і заўсёды, перамогаю ўраду. На гэты раз атрымана вялікая перамога; урад атрымаў магчымасьць выдаваць сабе за «дэмакратычны» ўрад: за ўрад нацыянальнай селянскай партыі галасавала 78 проц. прысутных выбаршчыкаў. Чым тлумачыць прыход да ўлады „дэмакратычнай" партыі? З якой мэтай рэгенцтва, цалкам забранае ў рукі стоячай на ўладзе лібэральнай партыі—моцнай і добра арганізаванай партыяй румынскага фінансавага капіталу,—спрабуе вырашыць палітычны крызіс шляхам перадачы ўлады ў рукі «дэмакратычнай» нацыянальнай селянскай партыі?

Адказ напрашваецца сам сабою: відаць, нацыянальная селянская партыя—партыя ні ў якім разе не дэмакратычная. Гаворачы канкретна, прычыны зьмены ўраду наступныя:

Першае—унутранае становішча, эканамічны крызіс, незадаволеньне рабочых мас гораду і вескі і ў значнай частцы дробнай буржуазеі. За апошнія 10 год правадыры нацыянальнай селянскай партыі, якая адыгрывае ролю апазіцыйнай партыі, умелі скарыстаць эканамічны крызіс і незадаволеньне шырокіх мас: дзякуючы іх напоўрэвалюцыйнай, а часамі і проста рэвалюцыйнай фразеалёгіі, гэта партыя зрабілася самай папулярнай палітычнай партыяй у краіне.

Другое—сьпешная падрыхтоўка імпэрыялістычнай вайны супроць СССР, у якой Румынія грае галоўную ролю; з гэтага пункту гледжаньня папулярны ўрад тыпу ўраду нацыянальнай селянскай партыі мае вялікія перавагі.

Трэцяе—эканамічныя інтарэсы чужаземнага капіталу. Тыя самыя імпэрыялістычныя колы, якія падрыхтоўваюць вайну супроць СССР, у той-жа час рыхтуюцца і да вайны паміж сабою ў барацьбе за эканамічную гегемонію. За гэтую гегемонію чужаземны капітал бязупынна вядзе ў Румыніі барацьбу з румынскімі капіталістамі, з лібэральнаю партыяю, на чале якой стаіць Братыяну, супроць якой настроена і частка румынскае буржуазеі, асабліва буржуазея далучаных нядаўна заходніх вобласьцяў. Гэта апазіцыйна настроеная румынская буржуазея здолела захапіць у свае рукі кіраўніцтва нацыянальнай селянскай партыяй, якая ня толькі здрадзіла інтарэсам незадаволеных шырокіх народных мас, ня толькі шукала заўсёды кампрамісу з лібэральнай партыяй, але і здолела зарэкамендаваць сябе чужаземнаму капіталу ў якасьці сапраўды буржуазнай партыі.

Чужаземны капітал здолеў скарыстаць унутрыпалітычнае становішча, палітычную сілу нацыянальнай селянскай партыі; але рашаючае значэньне ў справе зьмены ўраду адыграла клясавая барацьба ў горадзе і вёсцы: то распаляючыся, то заціхаючы, гэта барацьба вельмі моцна давала сябе адчуваць і, як вулькан, пагражала катастрофай.

У доказ таго, што гэта іменна так, мы падамо шэраг фактаў, характарызуючых становішча напярэдадні зьмены ўраду.

«Дрептатэа», орган нацыянальнай селянскай партыі, у нумары ад 24 кастрычніка 1928 г., агаласіў частку дакладу акруговага доктара Орхэй. У гэтым дакладзе між іншым гаворыцца:

«У акрузе ёсьць 8.410 сялянскіх сем'яў, зусім пазбаўленых прытулку, тысячы іншых жывуць у зямлянках. Такіх зямлянак 3.502. Кароў мамаюць толькі 20 сем'яў. Сьмяротнасьць дзяцей да 2 год дасягае 44,4 проц.".

Гэты жудасны малюнак у Румыніі не зьяўляецца нечым выключным, асабліва ў Бэсарабіі, у Старой Румыніі і ў Дабруджы. Няма чаго дзівіцца, што пры найменшым неўраджаі пачынаецца масавы голад. Такі голад перажывае Румынія і зараз. Урад лібэральнай партыі асыгнаваў на дапамогу насельніцтву галодных райёнаў 40 млн. лей, а ў сапраўднасьці на гэта патрэбна будзе 500 млн. лей.

Аднак неўраджай тлумачыцца зусім ня сушаю, як тлумачыць справу румынская пануючая класа, але становішчам сялянства наогул, і ў першую чаргу неадпаведнасьцю так званай аграрнай рэформы. Нават згодна афіцыйных даных, звыш 900.000 сялян, па закону меўшых права на надзел зямлёю, ніякай зямлі не атрымалі „за адсутнасьцю патрэбнай зямельнай плошчы і в прычыны немагчымасьці не павялічэньня", (з прамовы Братыяну 24 лістапада 1928 г.). Між тым і зараз яшчэ 2 в пазлов. млн. гектараў (г. зн. 1/3) „экспрапрыяванай" зямельнай плошчы не папала ў рукі занесенага ў сьпісы сялянства. Агульнае становішча сялянства так малюецца адным сельскім гаспадаром—прафэсарам: «Прычынаю неўраджаю трэба лічыць ня сушу, бо ў Бэсарабіі сёлета выпала дажджу ня менш, як звычайна; вінавата апрацоўка зямлі—адсутнасьць сродкаў, адсутнасьць рабочай жывёлы. Значэньне «сушы» ўзрастае па меры аб'яднаньня сялянства. У Бэсарабскага селяніна ёсьць два ворагі—зборшчык падаткаў і жандарм («Адэвэрул»—27 кастрычніка 1928 г.)

У горадзе становішча працоўных пластоў насельніцтва ня лепшае. Згодна афіцыйных даных, ёсьць 128.000 беспрацоўных прамысловых рабочых; кожны дзень ідуць у пратэст тысячы вэксалеў, не хапае крэдытаў, ссуды процант дасягае 30-40 проц.; гандлёвы баланс увесь час пасыўны; сума мытных паступленьняў няўхільна зьмяншаецца; зьмяншаецца і сума паступаючых падаткаў (ня гледзячы на рашучыя адміністрацыйныя меры, якія часта вядуць да крывавых сутычак) і г. д.

Такім чынам, выбражальна-рэвалюцыйная партыя прышла да ўлады пасьля 10-гадовага знаходжаньня ў апазіцыі, пасьля 10-гадовай дэмагогіі, пасьля таго, як яна паказала сваю здольнасьць зьбіраць мільёны галасоў у абставінах тэрору і ўзмацненьня эканамічнага крызісу. Зусім зразумела, што масы маюць дэмакратычныя ілюзіі; ілюзіі мае ня толькі селяніна, гаразкі дробны буржуа і дзяржаўны чыноўнік,—іх мае і прамысловы работчы. Зразумела, гэта сьведчыць аб слабасьці рэвалюцыйнага рабочага руху, але факт застаецца фактам.

Пасьля арганізаваньня ўраду нацыянальнай селянскай партыі дэмакратычныя ілюзіі разгарэліся ў полымя народнага энтузіязму. Масы сустракалі лідэраў ураду кветкамі, дробныя правадыры іншых буржуазных партый выходзілі з гэтых партый і ўступалі ў нацыянальную селянскую партыю. Дэмакратычныя ілюзіі ўзмацнелі дзякуючы устанаўленьню некаторай палітычнай свабоды і дэмагагічным мерам ураду. Цэнзура для друку адмецена, асаднае становішча захавана толькі на 10-15 кілёмэтраў уздоўж межы з СССР і Вэнгрыяй (але і там за выключэньнем буйных гарадоў).

Селянскія масы атрымалі некаторую свабоду дзеяньняў: у некаторых вёсках сяляне зьбілі і прагналі бургомістраў, зборшчыкаў падаткаў і некаторых абшарнікаў.

Параўнаўшы цяперашнія вынікі выбараў з ранейшымі, мы ясна бачым упыў дэмакратычных ілюзій. У 1926 і 1927 г. г. парляманцкія выбары праходзілі ў абставінах тэрору і ашуканства, і, аднак, «дэмакратычная» нацыянальная селянская партыя зьбірала кожны раз тры чвэрці мільёну галасоў.

Цяпер выбары праходзяць параўнаўча вольна, і, аднак, колькасьць галасоў, пададзеных за ўрад, узрасла і у абсалютных лічбах, і ў процантных адносінах, а колькасьць галасоў, пададзеных за буржуазныя апазіцыйныя партыі, зьменшылася. За выключэньнем буйнай партыі вацыянальных меншасьцяў (вэнгерская партыя) і рабоча сялянскага блёку, усе партыі атрымалі менш галасаў, чым раней. Недастатковы посьпех рабоча-сялянскага блёку заслугоўвае больш уважлівага аналізу.

Пад рабочымі партыямі я разумею румынскую кампартыю, рабоча-сялянскі блёк (гэта, ня партыя, але палітычная рэвалюцыйная рабочая арганізацыя, прымаўшая ўдзел у выбарах) і сацыял-дэмакратычную партыю.

Сацыял-дэмакратыя няхільна ідзе па шляху здрадніцтва.

Яшчэ год таму назад яна стварыла адзіны фронт з нацыянальнай селянскай партыяй, якая адкрыла «базы наступ» на лібэральны ўрад. У сапраўднасьці, гэта было поўнаазначна адмаўленьню ад самастойнага існаваньня сацыял-дэмакратычнай партыі.

Румынская кампартыя ўжо цэлых пяць год знаходзіцца ў падполлі, яна пазбаўлена магчымасьці непасрэднага ўдзелу ў выбарах. Кампартыя ўдзельнічала ў гэтых выбарах выпускам нелегальнага маніфэсту праклямацыйнага характару, і члены яе ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі. Увесь цяжар выбарчай кампаніі ляжаў на плячох рабоча-сялянскага блёку, якому прыходзілася мець дачыненьне з цэлым сьветам ворагаў.

Сьпіс рабоча-сялянскага блёку ўсюды выстаўляюць, як сьпіс камуністычны. Супроць гэтага сьпісу вялі ў гэты раз паход і ўрад, і сацыял-дэмакратычная партыя, і буржуазная апазіцыя, і «незалежны» друк. Хоць у меншай меры, чымся раней, але ўсё-ж урад тэрарызаваў рабоча-сялянскі блёк. Аднак, рэвалюцый

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Да ўсіх асьветнікаў Беларусі.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ.

У сучасны момант, згодна пастановы ЦВК БССР, праводзіцца конкурс на лепшую сэкцыю гарсавету і лепшы сельскі і местачковы газеты з іх камісіямі.

Гэты конкурс ставіць сваёй мэтай выяўленьне больш ініцыятыўных і працаздольных саветаў, іх сэкцый і камісій, што павінна паслужыць яшчэ большым ажыўленьнем і ўмацаваньнем іх працы.

Як відаць з матар'ялаў, якія маюцца ў ЦП саюзу, а таксама і з тых карэспандэнцый, якія зьмяшчаюцца ў дружу, удзел асьветнікаў у гэтай кампаніі нязначны. А паміж інтым асьветнік ня можа стаяць з боку і ня прымаць актыўнага ўдзелу ў гэтай працы. Добра наладжаная праца ў гарсавеце, сельсавеце, яго сэкцыі, камісіі—гэта вырокі крок наперад у будаўніцтве нашай сацыялістычнай гаспадаркі; гэта—добра наладжаная праца ў нашай школе, бібліятэцы, хаце-чытальні і г. д.

Праходзячая ў сучасны момант справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў зьяўляецца найлепшым момантам дзеля шырокага ўдзелу асьветнікаў у гэтай працы. Прымаючы непасрэдны ўдзел у працы саветаў, прымаючы актыўны ўдзел у справаздачных і перавыбарчых сходах,—асьветнік павінен актыўна выяўляць усе дадатныя і хворыя бакі працы гэтых органаў. Усё тое, што можа зьявіцца прыкладам—як трэба і ня трэба працаваць, павінна неадкладна знаходзіць месца ў нашым друку, насьцянгазэтах і г. д.

Конкурс на лепшы савет, яго сэкцыі, камісіі, згодна пастановы ЦВК Беларусі, павінен скончыцца да 1-га красавіка.

Прэзыдыум ЦП саюзу працасьветы заклікае ўсіх асьветнікаў у астаўшыйся час прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай працы.

Прэзыдыум ЦП упэўнены, што асьветнік сваім шчырым удзелам у працы саветаў, іх камісій сэкцый, сваім удзелам у выяўленьні і высьвятленьні дадатных і адмоўных бакоў працы нашых органаў разам са ўсёй савецкаю грамадзкасьцю дапаможа яшчэ больш шпаркаму ажыцьцяўленьню лёзунгаў нашай камуністычнай партыі па індустрыялізацыі краіны, па рэканструкцыі і інтэнсыфікацыі нашай сельскай гаспадаркі.

З таварыскім прывітаньнем:

Прэзыдыум Цэнтральнага Праўленьня саюзу працаўнікоў Асьветы Беларусі.

Асьветнікі выбіраюць.

Зала 1 сьнігоўкі ўсё больш і больш запаўняецца асьветнікамі, якія зьбіраюцца дзеля выбараў гарсавету. Асобнымі гурткамі гутараць пра наказ, пра кандыдатаў. Відаць, што асьветнікі зацікаўлены ў добрым складзе гарсавету.

Чакаюць пачатку сходу.

— На сход зьявілася 92 проц. выбаршчыкаў, кажа старшыня.—Сход мо'ну адкрыцьцю.

Хутка бяз спрэчак абіраюць прэзыдыум. Чытаюць наказ. У залі панае цішыня. Слухаюць уважліва, каб не прапусьціць які-небудзь пункт наказу.

— Адклікаць дэпутата трэба тады, калі ён ня зьявіцца на пасяджэньне гарсавету бяз уважлівых прычын тры разы,—чуецца заўвага асьветніка.

Дадатак уносіцца бяз спрэчак.

— Больш аказваць агранамічнай дапамогі васельніцтву,—уносіцца другі дадатак.

— Сачыць за рацыянальным скарыстоўваньнем гарадзкімі земляробамі сваіх земляў, бо ёсьць шмат залежаў.

Узьнікаюць вялікія спрэчкі, ці патрэбна адчыняць у Слуцку аддзяленьне. Толькі пасьля растлумачэньняў старшыні гэтага дадатку не ўносяць. Асабліва актыўна абгаворваюцца разьвезены наказу аб дабрабыце горада і культурным будаўніцтве. У гэтым разьвезены ўносіцца найбольш дадаткаў.

— Неабходна зачыніць тры сынагогі і царкву ў вайсковым гарадку і перадаць іх пад культурныя ўстановы.

— Адпусьціць лепшае памяшканьне пад краязнаўчы музей.

— Найбольшую ўвагу зьвярнуць на летнія экскурсіі вучняў, як далёкія, так і па сваім раёне.

— Адпусьціць памяшканьне пад інтэрнат для бедных вучняў.

— Пакланаціцца ў далейшым аб адчыненьні ў горадзе школы для разумова-адсталых вучняў.

Шмат іншых дробных дадаткаў было ўнесена ў наказ. Увогуле ў гэтым годзе заўважаецца большая актыўнасьць і зацікаўленасьць асьветнікаў. У той час, калі ў мінулыя гады яўка асьветнікаў была 70-80 проц., у гэтым годзе яна дасягнула 95 проц. Толькі не зьявіліся тыя, каго ў гэты час ня было ў горадзе.

У гарсавет абраны два партыйцы, адна камсамолка і адзін беспартыйны настаўнік. М—ц.

(Слуцак).

Школу трэба ўпарадкаваць.

(Віцебскі р., Віцебск. акр.)

У нашай Адамаўскай школе за апошні час пачасьціла часта перабоі ў школьным жыцьці, якія цяжка адбіваюцца на справе. Памяшканьне школы патрабуе капітальнага рамонту, не апалівецца за адсутнасьцю апалу, і вучні прымушаны ці мерзнуць ці вусіх ня прыходзіць у школу. То заняткі спыняюцца з прычыны хваробы настаўніцы, або з прычыны паездкі яе на сямейных справах у Віцебск.

Амаль ніякай увагі не зьвяртаецца і на антырэлігійнае выхаваньне школьнікаў, што выяўляецца на сьвяткаваньні вучнямі, асабліва старарамі, шмат чыста царкоўных сьвятаў і ў шырыя вымаганьні розных рэлігійных абрадаў. Ня відаць належнага ўплыву школы і на культурнае жыцьцё акалічнага насельніцтва.

Усе гэтыя сумныя зьявішчы трэба было-б хутчэй зьнічыць. У выпадку зацяжнай хваробы настаўнікаў як у нашай, так і ў іншых школах, Акрана ці Райана трэба было-б мець у сябе і пасылаць у такія школы асобных намесьнікаў, якія маглі-б часова выконваць службовыя абавязкі адсутнічаючых асьветнікаў.

Кулікаў.

Цёплыя сьнеданьні.

З гэтага навучальнага году ў школах Лагойскага раёну (Мін. акр.) уведзена харчаваньне дзяцей беднаты. Арганізаваны з насельніцтва камісіі па дапамозе вучням беднаты, сродкі зьбіраюцца па падпісных лістох, праз суботнікі і лётарэі. Дзеці пачалі больш акуратна хадзіць у школы. Насельніцтва стала больш звярачаць увагі на жыцьцё школ.

Я. С.

Лагойскі р., Менчына.

ТАВ. БУШМАН ДАЕ „УСЫПКУ".

Любяць, часам, нашы раённыя адміністратары палаяць настаўніцтва, бо гэтым, кажуць, мы свой аўтарытэт падымаем...

Возьмем да прыкладу апошнюю канфэрэнцыю асьветнікаў Лагойскага раёну (Менчына).

— Слова для дакладу на тэму аб удзеле асьветнікаў у справаздачна-перавыбарчай кампаніі мае старшыня РВК тав. Бушман,—анансуе ціцуны член прэзыдыуму.

Настаражыліся асьветнікі, кожны жадае пачуць—як і што трэба рабіць у часе кампаніі.

З пачатку яно, здаецца, было і нішто сабе. Пагаварыў дакладчык у міжнародным маштабе, перайшоў да міжнародных акулаў моцуд, спыніўся на спробах кулацтва падпарадкаваць свайму ўплыву беднату і серадняцтва. Адным словам, усё ішло як па маслу, пакуль дакладчык не перайшоў да ўдзелу асьветнікаў, а як перайшоў, дык і пашоў...

— У нас, кажа, некаторыя настаўнікі ня то што спачуваюча, а наадварот—з кулакамі разам...

— У нас, кажа, настаўнік Язэп С. на справаздачным сходзе агітаваў супроць 15-рублёвага паю ў кааперацыі. Ячу, кажа, трэба добра ўсыпаць...

— Мана гэта,—дае з месца рэплику абураны выпраўдай настаўнік.

— Мы гэта давядзём дакумэнтамі, —перабіў настаўніка т. Бушман і зараз-жа паслаў за пратаколам таго сходу, на якім настаўнік нібы вёў агітацыю.

Заслухалі даклад, пераправіліся. Перайшлі да іншых пытаньняў і старшыня РВК, як гэта гаворыцца, зьбуўся...

Праз некаторы час прыносіць гэты „злополучны" пратакол. Чытаюць...

Язэп то—Язэп, але ня той... Гаварыў пра най, ды ня тое...

Сапраўды, з пратаколу відаць, што селянін Чуприс Язэп казаў зусім не аб 15 рублёвым паі, а вагул аб тым, што беднае цяжка яго ўносіць, бо фонду кааперазьваньня на ўсіх не хапае...

Добра, што пратакол знайшлі, ато на настаўніку так і засталася-б незаслужаная пляма.

В. Зайцаў.

Пра дапамогу вучнёўскай беднаце

Вынікі выбарчага абсьледваньня некаторых школ Менскай, Магілеўскай і Аршанскай округаў і матар'ялы аб сацыяльным складзе пятых груп сямігодак сьведчаць аб тым, што сацыяльны склад школ, асабліва II канцэнтру сямігодак, нездавальняючы.

Побач з гэтым абсьледваньне кажа аб тым, што мы маем значны адсоў дзяцей батракоў і беднаты ўжо ў пачатку навучальнага году. Назіраецца таксама на мясцох грубае парушэньне клясавай лініі пры разьмеркаваньні нагрузкі паміж вучнямі і забясьпечаньні апошніх інтэрнатамі. Ня пры ўсіх школах прыпадуты мясцовыя грамадзкія арганізацыі і самае насельніцтва да ўмацаваньня фонду дапамогі беднаце. Больш таго, яшчэ ня ўсюды скарыстаны поўнасьцю бюджэтныя сродкі на гэту справу і нават ёсьць выпадкі скарачэньня фонду, або выдаткаваньня значнай часткі яго не па прызначэньню. Так, у Аршаншчыне з 5900 руб. скарыстана на дапамогу беднаце ўсяго 4000 руб., у Меншчыне з 10820 руб.—7423 руб. і у Магілеўшчыне з 9000 руб.—усяго 4000 руб.

Як значны недахоп трэба адзначыць, што акруговыя інспэктарыяты нарасьветы, райвыканкомы і сельсаветы у пачатку навучальнага году не правялі шырокай кампаніі па большаму ўцягненьню ў школы дзяцей батракоў і беднаты і нават зараз не вядзецца сыстэматычнай працы па замацаваньню іх у школах на працягу навучальнага году і ўсяго курсу навучаньня.

Неабходна, пакуль яшчэ ня позна, зараз-жа прыняць на мясцох меры да арганізацыі пры кожнай школе за кошт мясцовых грамадзкіх арганізацый фонду дапамогі дзецям беднаты і батракоў. Павінны таксама быць прыняты меры да своечасовага і поўнага скарыстаньня сродкаў, якія адпушчаны ў фонд дапамогі беднаце, не дапушчаючы яго скарачэньня або скарыстаньня не па прызначэньню.

Каб затрымаць дзяцей беднаты і батракоў у школе да канца навучальнага году, трэба дабіцца, дзе гэта патрэбна, арганізацыі пры школах начлежак для дзяцей батракоў і беднаты, арганізаваць для іх гарачыя сьнеданьні, арганізаваць дапамогу школьнапасьпяваючым дзецям гэтай сацыяльнай групы. За кошт сродкаў фонду дапамогі дзецям беднаты забясьпечыць па магчымасьці больш бедных вопраткай і абуткам. У гэтай галіне могуць аказаць значную дапамогу жаночыя далегацкія сходы, якія могуць наладзіць шыцьцё бялізны і вопраткі для бяднейшых вучняў.

Чакаем дапамогі.

(Багушэўскі р., Аршаншчына).

Прызначылі да нас, у Багушэўскі райён, інспэктарам нар. асьветы студэнта, які ніколі не працаваў у школе і на грамадзкай працы, і не дапамагаюць яму ўвайсьці ў курс працы. Працуе небарака, як бог на душу палажыць, без кантролю. У выніку—адсутнасьць працы ў палітыка-асьветнай галіне.

Сходу па пытаньнях палітасьветы ня было ад прошлай зімы, і нідзе ў райённых арганізацыях не абгаварвалася праца ў гэтай галіне.

У сельскіх палітыка-асьветных установах праца вядзецца стыхійна з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва імі. У інспэктара няма ніякай працы ў палітасьветнай галіне. Ён ссылаецца на сваю непасрэдную, садыхаўскую.

У зьвязку са слабай працай палітыка-асьветных устаноў, пашыраецца праца розных сэктаў, пары падымаюць галовы. Адзін поп арганізаваў вакол сябе актысавецкі элемент і зараз дабіваецца адчыненьня царквы ў центры райёну.

Райвэтадком зусім не працуе, школ абгледжана мала. Інспэктар не карыстаецца аўтарытэтам сярод асьветнікаў—яго лічаць прафанам пэдагагічнай і мэтадычнай справы. С—ы.

Магілеўская хроніка.

Школьныя стыпэндыі ў сямігодках.

З агульнага школьнага фонду на дапамогу дзецям беднаты вылучаны, згодна пастановы акрвыканкому, 253 стыпэндыі, на 25 руб. кожная, на выдачу батракам і дзецям беднаты, якія навучаюцца ў сямігодках.

Дыфэрэнцыраваныя стыпэндыі ў прафтэхшколах.

Замест існаваўшых у прафтэхшколах адмольных стыпэндый, зараз уведзены дыфэрэнцыраваныя стыпэндыі (у 8, 12 і 14 рублёў).

Новыя пасады райпалітінспэктароў.

Згодна пастановы акрвыканкому, утвораны пасады райпалітінспэктароў у 4 раёнах—Магілеўскім, Клімавіцкім, Быхаўскім і Шклоўскім.

З лістоў.

— Вучні 1-ай Дубровенскай сямігодкі (Аршаншчына) сабралі на самалёт «Вучань» 22 рублі. Вучні гэтай школы амаль што ўсе дзеці беднаты.

— Інспэктар нарасьветы Глускага раёну (Бабруйшчына) зусім мала ўвагі аддае хатам-чытальням. Кнігі ў бібліятэках старыя, новага нічога ім не даюць.

САМААБКЛАДАНЬНЕ—НА КУЛЬТУРНУЮ ПЕРАБУДОВУ ВЁСКІ.

ХОД САМААБКЛАДАНЬНЯ.

Магілеў, 16-1. Самаабкладаньне сёлета праходзіць, наогул кажучы, добра і нашмат больш гладка, чымся ў мінулым годзе.

Ужо амаль не пачуеш апаскі на сходзе, што грошы пойдуць не на карысьць вёскі. Зразумела, што найлепшы настрой на сходах тых вёсак, дзе сельсавет гаспадарча і ашчадна скарыстаў самаабкладаньне мінулага году.

Такім чынам, настрой сялянства добры і калі тым ня менш, яшчэ не праведзена і палавіны ўсіх сходаў, якія належыць правесьці для прыняцьця самаабкладаньня, дык у гэтым вінны райвыканкомы і сельсаветы, якія гэтай справе не аддаюць належнае ўвагі. Між тым, ні ў якім разе нельга паўтараць памылку мінулага году, калі самаабкладаньне зацягвалася да вясны і нават да лета.

Найчасьцей вітаюцца прызначэньне самаабкладаньня—школьныя патрэбы, далей—шляхі, масты, пажарная ахова, набудова студэнаў.

Таксама трэба адзначыць імкненьне сялян да адкрыцьця мэдыцынскіх пунктаў (у Карматскім, Журавіцкім, Чырвонапольскім і некаторых іншых раёнах), але пры гэтым дрэнна вылічваецца (у бок зьмяншэньня) каштоўнасьць утрыманьня гэтых пунктаў, на што райвыканкомам трэба зьвярнуць увагу, каб пасьля ня было незадавальненьня з боку сялянства.

Нарэшце, некалькі слоў аб перашкодах з боку кулацкага элементу. Напрыклад, у вёсцы Шломах, Прапойскага району і у вёсцы Бохані, Журавіцкага раёну ў мінулым годзе было прынята самаабкладаньне; адпаведная «падрыхтоўка» вялецца і сёлета. Але часьцей наглядаецца імкненьне заможных вышэйшіх прыцаны самаабкладаньня (напрыклад, вёска Загараньне), або правесьці самаабкладаньне „земскім" спосабам—з зямлі, «з двага» (вёска Янаўка у Чырвонапольскім раёне і інш.).

Самаабкладаньне прымаецца адналосна.

(Ларыцкі раён, Бабруйскі округі).

Кампанія па правядзеньню самаабкладаньня на 1928-1229 год на нашым раёне пачалася з сьнежня месяца і у сучасны момант гэта кампанія заходзіцца ў самым разгары. Да гэтага часу, па маючыхся ў райвыканкоме зьвестках, прынята самаабкладаньне ў 55 насельніцкіх пунктах. Першымі на правядзеньню самаабкладаньня ідуць Казлоўскі, Рэкшынскі і Коўчыцкі сельсаветы.

Самаабкладаньне прымаецца галоўным чынам на школьнае і дарожнае будаўніцтва і на супроцьпажарную ахову і, амаль-што на усіх вёсках цалкам на 25 проц. ад сельска-гаспадарчага падатку, за выключэньнем вызначнай часткі вёсак, дзе прынята ў меншым процанце (Рожныя 20 пр Казлоўка 15 проц., Майсеўка 20 пр., Сьцяны 20 пр.) Ёсьць выпадкі, што прымаецца і больш 25 проц. (Вярхлесьсе з пасёлкамі 35 проц.)

З практыкі мінулага году сялянства упэўнілася, што сабраныя імі сродкі па самаабкладаньні сапраўды скарыстаны на тыя мерапрыемствы, якія вызначаліся на сходах: на культурна-гаспадарчыя, санітарныя і дабрабытныя патрэбы вёскі, а таму ў гэтым годзе кампанія па самаабкладаньню праходзіць лепей і пры правядзеньні сходу у большасьці вёсак прымаецца адналосна. Былі выпадкі, калі сялянства прыходзіла ў с-с і прасіла зьвяціцца ў вёску для правядзеньня самаабкладаньня.

Анішчанка.

Самаабкладаньне на дабрабыт вёскі.

(Ліст з Бабруйску).

Работа па практычнаму прыстасаваньню сродкаў, сабраных па самаабкладаньню на Бабруйшчыне сьпічана. Цяпер ужо можна падвесьці вынікі гэтай работы і таму, які эфэкт стварыла самаабкладаньне на вёсцы.

Аб выніках гавораць ліцбы. За сродкі самаабкладаньня палепшыўся значна дабрабыт вёскі. За гэтыя сродкі на акрузе праведзена ва ізарная работа: набудавана 38 школ адрамантавана 150 школьных памяшканьняў, адрамантавана 11 памяшканьняў больніц, 7 памяшканьняў аптунктаў. На гэтыя мэты выдаткавана было на акрузе 216 тысяч рублёў грошай.

Значная доля сродкаў пашла на супроцьпажарныя мерапрыемствы. Сюды выдаткавана звыш 29 тысяч рублёў; закуплена звыш паўсотні пажарных машын, набудавана 46 пажарных хлявоў, закуплена супроцьпажарнае прыстасаваньне.

На дарожнае будаўніцтва в агульнай сумы сабраных па самаабкладаньню ў 334 тысячы рублёў выдаткавана звыш 30 тысяч рублёў. Сюды адносіцца набудова масткоў, грэблеў і іх паправаньне.

Трэба сказаць, што самаабкладаньне мінулага году апраўдала сваю каштоўнасьць і прынесла поўную карысьць. Праўда, у скарыстаньні сродкаў ад самаабкладаньня не абдзілася чысота сельска-гаспадарчыя моманты (моманты палепшэньня жывёлаводзтва, здабыцьцё с.-г. машын і г. д.) Гэта трэба лічыць прабелам, бо з агульнай сумы сабраных ад самаабкладаньня на купаю 23 выноў вытворчнаў скарыстана зусім незначная сума. Іншыя сельсана-гаспадарчыя патрэбы ня высоўваліся пры мэтапрызначэньні сродкаў, якія паступілі ад самаабкладаньня.

Недахватамі правядзеньня самаабкладаньня мінулага году трэба прызнаць тое, што самаабкладаньне праводзілася без усялякіх якіх небудзь плянаў практычнага прыстасаваньня гэтых сродкаў. У сілу гэтага выходзіла, што некаторыя вёскі, ад якіх па самаабкладаньню належала паступленьне 100-200 руб., выносілі пастанову аб набудове школы коштам у 10-12 тыс руб.

Недахопам трэба прызнаць і адсутнасьць тэхнічнага нагляду над будаўніцтвам, якое праводзілася за сродкі ад самаабкладаньня.

Усё ж выніні будаўніцтва на сродкі ад самаабкладаньня зазнавалі аўтарытэт сярод сялянства і самаабкладаньне ў бягучым годзе праводзіцца значна лягчэй. У большасьці вёсак сялянства само высоўвае пытаньне аб самаабкладаньні, прычым ёсьць выпадкі правядзеньня самаабкладаньня больш, як на 25 проц. Вось прыклады правядзеньня самаабкладаньня гэтага году на вёсцы.

Самаабкладаньне бягучага году ў большасьці вёсак Парыцкага раёну прымаецца адналосна. Ёсьць выпадкі, калі сялянне самі прыходзяць прасіць правесьці самаабкладаньне—пішуць з Парыцкага раёну.

Такіх прыкладаў шмат Самаабкладаньне ўвайшло ў быт сялянства, стала—адзінымі шляхам хутчэйшага палепшэньня дабрабыту вёскі пры самадзейнасьці сялян тых.

А. ДАМБРОЎСКІ.

Ініцыятарамі самаабкладаньня зьяўляюцца беднякі і сераднякі.

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта).

Бачачы карысьць самаабкладаньня мінулага году—сялянства Аршаншчыны з вялікай зацікаўленасьцю ўзялося за правядзеньне новага самаабкладаньня.

Ініцыятары правядзеньня самаабкладаньня бяднацка-серадняцкая частка вёскі і люты вораг гэтага нерапрыемства—кулак і заможнік.

У в. Вышава, Мсьціслаўскага раёну, супроць самаабкладаньня выступіла сабра сельсавету, дачка кулака, Лісоўская. Яе падтрымалі кулакі Трусаў Я., Быкаў А., Халасевіч К. Яны не жадалі праводзіць самаабкладаньне, бо ім прыдзецца нямала плаціць. Але беднята дала належны адпор кулацтву і самаабкладаньне праведзена на 25 проц. ад уплатваемага сельгаспадатку.

У Ракцянскім с.-с., Горацкага р., пры правядзеньні самаабкладаньня кулакам удалося сарваць два сходы.

Сарвалі кулакі сход і ў в. Клін, Мсьціслаўскага р.

Аб актыўным выступленьні кулацтва супроць самаабкладаньня паведамляюць ад усюды: 8 7 вёсак Мазалаўскага сельсавету, Мсьціслаўскага раёну, в 14 вёсак Веранейскага сельсавету, Дубровенскага раёну, в палага шэрагу вёсак Круглянскага р. (Зацярцкі, Старкі і інш.), в в. Дворышча і м. Бабра, Крупскага р.

Але абʼяднаная беднята дае рашучы, цьвёрды адпор кулакам і самаабкладаньне ўсюды праводзіцца ў разьмеры 25 проц. ад сельгаспадатку. У многіх вёсках самаабкладаньне прымалася пад гучныя воплескі і сьпеў беларускай марсэльезы.

На 8-е студзеня па акрузе самаабкладаньне прынята па 2184 вёсках—на суму 241465 руб. Заданьне выканана на 83 проц., некаторыя раёны ўжо перавысілі заданьне. Напрыклад, Ляцянскі раён выканаў заданьне на 137 проц. і Крупскі на 106 проц.

—Адрамантаваць школу, абсталяваць хату-чытальню, дапамагчы вучням беднякам,—такую пастанову вынес сход сялян в. Варанцэвічы Талочынскага раёну.

Сяляне в. Стражава, Дубровенскага раёну сродкі ад самаабкладаньня пастанавілі скарыстаць на пашырэньне школы, каб у ёй можна было навучаць па 100 дзяцей.

У м. Смальянах, Коханаўскага раёну за самаабкладаньне пастанавілі адрамантаваць пардом і школу; сяляне в. Горлава Расьнянскага раёну—на адчыненьне ў вёсцы хаты-чытальні і на закупку для яе літаратуры; сяляне в. Шышава Горацкага раёну—на гаспадарчыя патрэбы школы; в. Заранча, Круглянскага р.—на адчыненьне лікпункту.

Сяргей Асот.

Беднота і серадняцтва—да новых перамог на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі.

(Круглянскі раён, Аршаншчына).

Паляпшэньне вынікі правядзеньня самаабкладаньня на 1928-29 год пачаваюць вялікі ўдзел паліт-сьвядомасьці і актыўнасьці батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі, іх уразуменьня задач сацыялістычнай перабудовы вёскі.

На 20-XII-28 г. па Круглянскаму раёну самаабкладаньне прынята ў 57 вёсках. Сялянства, асабліва асноўная яго маса, батрак, бядняк і серадняк у сёлетнім годзе, як ніколі, актыўна ўдзельнічае ў абгаварваньні патрэб, на якія неабходна правесьці самаабкладаньне.

Кулак стараецца сарваць мерапрыемствы батрацтва і беднаты па палепшэньні гаспадарчага і культурнага дабрабыту вёскі, але-ж бядняк у цесным саюзе з серадняком даюць рашучы адпор вылазкам кулацтва ў гэтай працы.

Вось некаторыя прыклады:

У в. Зацярцкі, у мінулым годзе пры правядзеньні самаабкладаньня кулацкая частка зрывала сход тры разы, у сёлетнім годзе беднота рашуча выказалася за правядзеньне самаабкладаньня і яно было праведзена пад бурныя воплескі беднаты і серадняцтва і сьпеў беларускай марсэльезы, а кулакі стаялі ў парозе скрыжучы зубамі, адчуваючы сваё поўнае бясьсільле.

У бяднядкай вёсцы Араве, Скуратаўскага с-савету пасьля правядзеньня самаабкладаньня на ініцыятыве камсамольскай ячэйкі быў набудован вечар самадзейнасьці. Самаабкладаньне мінулага году скарыстана добра. Сялянства, бачачы яго рэальныя вынікі, ахвотна вызначае новыя патрэбы на гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву вёскі: школьнае будаўніцтва, набудова бетонных студняў, ліквідацыя нянісьменнасьці, пажарнае і шляхавае будаўніцтва.

А. Зайцаў.

Вылезьлі з цемры.

(в. Кабыльле, Аршаншчына).

Нашая вёска была вельмі цёмная і некультурная. Ня было раней школы, а школа гэта зьяўляецца лепшым праваднікам культуры на вёсцы. Моладзь усёй вёскі займалася толькі тым, што бегала каля вакон, ды валялася ў грязі п'янай. На вёсцы было шмат нянісьменных.

Вялікім шчасьцем для нас зьявілася самаабкладаньне. Спачатку сяляне не згаджаліся на гэта, бо заможнікі ўзьнялі такую паніку, быццам гэтыя сабраныя грошы пойдуць не на карысьць вёскі. Але пасьля, калі нам прадстаўнік райёну добра растлумачыў карысьць самаабкладаньня, дык сяляне згадзіліся і пастанавілі ўзяць па 20 кап. з кожнага падатковага рубля.

Праз некаторы час грошы былі сабраны і пушчаны на палепшаньне нашае васковае школы.

Нанялі ў аднаго гаспадара прыгодное для школы памяшканьне, прыслалі настаўніка і дзеці сталі хадзіць у школу вучыцца.

Акрамя таго, цяпер камсамольцы нашае вёскі, дагаварыўшыся з настаўнікам школы, арганізавалі лікпункт, куды ходзяць дарослыя сяляне і моладзь, каб ліквідаваць сваю нянісьменнасьць. Лікпункт зараз ужо распачаў сваю працу і кожны тыдзень на 2 разы займаюцца. Вось толькі цяпер сяляне бачаць, якую карысьць прынясло самаабкладаньне, што яно пайшло на сваю карысьць і шчыра дякуе савецкую ўладу, што яна дапамагае ім вылезьці з цемры і некультурнасьці. «У другі раз мы таксама правядзем самаабкладаньне»—часта кажуць на сходах сяляне.

Мак—сні.

Пабудуем школу.

(Рагачэўскі р-н, Бабруйскае округі).

У мінулым годзе ў вёсцы Масеяўцы самаабкладаньне правялі на 35 проц. з падатковага рубля. На сабраныя грошы ўжо пабудавалі пажарны хлеў і заказалі рабіць пажарныя бочкі, адчынілі школу.

У гэтым годзе масеяўцы таксама не застаюць. 8-га сьнежня адбыўся агульны сход сялян вёскі Масеяўкі, на якім было пастаўлена пытаньне аб самаабкладаньні. Перш, чым паставіць гэта пытаньне, група беднякоў вёскі Масеяўкі сабраліся і абгаварылі гэта пытаньне, і парашылі: самаабкладаньне правесьці на 25 проц. з падатковага руб. і 25 проц. працай г. зн. вывезьці з лесу сялімі сіламі. Хто болей плаціць падатку той павінен болей працаваць.

Базыль Барашкоў.

АВАРЫЯ КУЛАКОЎ І „ДАЛІКАТЭС" З ТАГО СЬВЕТУ...

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Сьнежнае поле, сьнежныя прасторы—шырокія, неабсымныя... Я еду па Барысаўшчыне ўпаршыню. Нехта казаў, што вакол Барысава раскінуты лясы. Гледзячы на стройныя, звонкія сосны—успаміваю горад. Новенькія домікі вырасьлі па Нова-Барысаву.

Абапал дарогі беларуская славутая экспэртная сасна, якая зьмяніла твар Нова-Барысава, залечвае раны, нанесеныя белапалякамі. Пад гэтымі гнуткімі лапамі сосен партызаны хаваліся ў дванцатым, абараняючы Чырвоную краіну. Гэтыя сосны шмат чаго бачылі...

Гарэлі балоты, гарэлі бярозы, асіна, волька, гарэла сасна... Гарэлі сяльбіны, гумны, вёскі, Барысаў гарэў. Людзі задыхаліся ў полымі пажараў, тарчма ляцелі ад куляметнага агню; гулкі рогат гармат рэхам на бару гудзеў...

Час ішоў. Жыцьцё ўвайшло ў спакойныя берагі. Сёньня толькі мой вазьніца, жыхар гор. Барысава, Захаравіч, удзельнік барацьбы з белапалякамі, успамінае аб мінулым.

— Вось каля гэтай вёскі была страшная бойка...

— А за тым курганчыкам расстралялі майго знаёмага...

— А з таго лесу вунь, што ледзь відніецца, нашы падводчыкі ўпякалі ад палякаў. Аднаго зазвялі... Болей яго ня бачылі...

Дваццаціпяцікілёмэтравая дарога Барысаў—Забашэвічы нянрыкметна скончылася ў такіх размовах.

* * *

Якраз трапілі на першы арганізацыйна-выбарчы пленум Забашэвіцкага сельсавету. Ня вялікую, як першая чарга пленуму праходзіла, але абраньне рэвкамісіі і камісій пры сельсавеце, прайшло неяк вяла.

— Ну, каго ў камісію? Ну давайце кандыдатуры! — прапануе старшыня пленуму.

— Кіраўніком кааперацыйнай камісіі Яку,—прапануе нехта.

— І я за яго—згаджаецца старшыня.

— Ды ён-жа на сябра кааперацыі,—кажа нехта.

— Няважна, гэта нічога ня знача,—растлумачвае старшыня пленуму.

— Як гэта «няважна»,—пачулася некалькі галасоў.

— А як ён будзе агітаваць насельніцтва за кааперацыю, калі сам ідзе да прыватніка.

— Няважна, — зноў кажа старшыня.

Толькі дзякуючы таму, што большасьцю галасоў не прайшла кандыдатура пянайшчыка—абралі другога селяніна, сябра кааперацыі.

За другіх старшынь камісій галасавалі вяла, нехаця. Ня было той сур'ёзнасьці, усебаковага абгаварэньня, зацікаўленасьці, якія так неабходны, як сродак да ажыўленьня працы. Гэта хвароба ня толькі Забашэвіцкага сельсавету—ёсьць весткі, што і ў іншых сельсаветах ня лепш. Пакуль ня позна, трэба сур'ёзней аднесьціся да абраньня працаздольнага складу камісій пры сельсаветах. Якая-ж тады будзе праца, калі абраньне было абыякое? Як-жа камісіі будуць дапамагаць у разнастайнай працы сельсавету, калі будуць абраны непрацаздольныя таварышы?

Аднак, ня гледзячы на вышэйпаказаны недахоп, перавыбары па сельсавету прайшлі наогул добра.

* * *

Вось у вёсцы В. Забашэўка «людзі з розумам», «гаспадарчыя мужыкі» выступаюць і, б'ючы кулаком у грудзі, пытаюць:

— Да-куль-жа бу-дзе бе-дня-та?!

— Дакуль яны будуць галадранцамі?

— Дакуль у іх ня будзе хлеба хапаць?

„Вэзіцным", «неразумнымі», «з розумам» людзям хочацца паўтарыць адказ беднаты:

— Датуль, пакуль будзеце вы! Датуль, пакуль вы, замест пуда хлеба, пазычанага вясной бедняку, дзярэце з яго два пуды, ды яшчэ—дзень-два касьбы... Датуль, пакуль у Забашэўцы не праведзена землеўпарадкаваньне, не абрэзана ваша зяміла і не арганізаваны на ёй бядняцкі калгас. А гэта будзе, прыдзе гэты час—нарукаю таму рашучы адпор беднаты вам, кулакам...

У супроцьлегласьць кулацкім падхалімам у Забашэўцы падкулачнік вёскі Краснае—Шчэпка Паўла, выводзе «новую тэорыю» на стары лад:

— Беднаты няма! Усе сяляне роўныя.

Цябе пакрыўдзілі, Шчэпка Паўла!.. Якія яны злыя!.. Падатак вялікі накладзілі. А Архіпу і Сёмку зусім няма. Якія дзівакі! І злыя дзівакі! Усе-ж роўныя... Няважна, што ў аднаго каня няма, а ў другога тройка... Няважна. Усе роўныя...

„Людзі з таго сьвету" таксама заварушыліся. Гутарка ідзе аб папоўскіх дочках. Дочкам папа, беленькім, далікатным, абрыдла расьпяваць рамансы і розныя куплеты з пябачаных ніколі анэкдот—захацелася чагосьці большага, сур'ёзнага... Ну, напрыклад, кіраваць дзяржавай.

— Калі „кожная кухарка павінна кіраваць дзяржавай",—дык мы што?

Мы ўсё-такі ня кухарды варта, так-сяк адукаваны.

Гэта ня жарт і не фантазія.

Гэта факт сёньняшняга дня.

Дочкі папа прышлі на выбарчы сход вёскі Забашэвічы.

Сялянне абіралі прэзыдыум. У хаце было душна, ілосна, накурана. Але дочкам папа—далікатным—было занадта добра:—яны прысутнічалі на выбарчым сходзе. Іх магчі (ах, як прыемна!)—абраць... (ах, якая салодыч у грудзёх).

Ну, адну магчі абраць сакратаром сельсавету, а другую (хай другую і не абіраюць... Ня першыя выбары Налета як небудзь...).

— У прэзыдыум паступіла заява, што на сходзе прысутнічаюць грамадзяне, пазбаўленыя выбарчага права, а іменна дочкі папа,—абарваў салодкія мары старшыня сходу.

І далей:

— Прашу выйсьці з памяшканьня, —гэта патрабуе сход.

— Мы перашкаджаць ня будзем. Мы так толькі...

— Прашу выйсьці!

Старшыня быў настойлівы.

(— Ах, які ён грубы чалавек!).

Дочкі папа ўбачылі сваё беспаратнае становішча, забыўшы аб «далікатнасьцях», культурнасьці і іншых правілах грамадзкіх паводзін, груба са злосьцю адказалі рашучым, вострым запытаньнем:

— Калі-ж мы будзем кіраваць дзяржавай?

— Калі нас ня будзе!—адказалі некалькі галасоў.

З усёй сілы стукнуўшы дзьвярыма—папоўны вышлі.

— Правільна, правільна!—сьмяліся сяляне.

— Вам ужо давяраем „на тым сьвеце" кіраваць сьвятымі і грэшнікамі. Кіруйце на здароўе!

Цім. Зарачны.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ЦЫРКУЛЯРКА.

Усім акруговым выканкомам БССР

АБ УДАСКАНАЛЕНЬНІ СПРАВЫ ІНСТРУКТАЖУ САВЕТАЎ І РАЙЁННЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ К МІТЭТАЎ.

III Сесія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР па дакладу аб масавай працы саветаў адзначыла недахватасьць інструктажу ў рабоце апошніх з боку вышэйстаячых выканкомаў і прыняла пастанову аб забесьпячэньні якасьці інструктаваньня належным падборам інструктарскага складу выканаўчых камітэтаў і арганізацыі інструктажу пры больш буйных райённых выканаўчых камітэтах.

У выкананьне гэтае пастановы Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прыняў рашэньне аб увядзеньні ад імя штатнае адзінкі інструктара ў райёнах, якія налічваюць звыш 15 саветаў. Арганізацыя інструктажу дасьць магчымасьць палепшыць кіраўніцтва арганізацыйна-масавай работай саветаў у буйных раёнах, чаго амаль што нельга было ажыцьцяўляць да гэтага часу. Арганізацыя інстытуту інструктароў пры райвыканкомах не вырашае по-насьпраўдзе справы ўзмацненьня і палепшэньня кіраўніцтва масавай і практычнай дзейнасьцю саветаў. Ажыцьцяўленьне гэтае задачы можа быць вырашана пры ўмове правільнай арганізацыі інструктарскага апарату, правільнай і сталай арганізацыі яго работы.

Выходячы з гэтага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прапануе ўсім акрывыканкомам:

а) поўнасьцю ўкамплектаваць інструктарскія пасады пры акруговых выканаўчых камітэтах, а таксама і пры райённых выканаўчых камітэтах (дзе яны па норме вызначаны), падбіраючы на гэту работу прадуктыўнай дастатковай кваліфікацыі (адпавядаючай кваліфікацыі кіраўнікоў інструктуемага выканкому ці савету) і практычнага стажу ў савецкай рабоце (2-3 гады працы ў савеце альбо выканкоме);

б) забясьпечыць інструктарскаму складу акруговых і райённых выканаўчых камітэтаў найбольш прарагны перыяд прабываньня на інструктарскай рабоце і ні ў якім выпадку не дапушчаць парушэньня мінімальнага адпагадзінага тэрміну працы інструктара;

в) забясьпечыць за інструктарскім складам акруговых і райённых выканаўчых камітэтаў магчымасьць выкананьня шырокай інструктарскай работы і не дапушчаць нагрузкі інструктарскага складу рознаю тэхнічаю дробнаю работаю альбо скарыстаньня яго не па прызначэньні;

г) даць найбольш поўную магчымасьць інструктарам узьвышаць сваю кваліфікацыю праз забясьпячэньне іх адпаведнаю літаратурою, перыядычнае правядзеньне нарад інструктарскага складу, прыцягненьне іх да ўдзелу ў рабоце пленумаў і прэзыдыумаў выканкомаў і саветаў;

д) устанавіць адпастайнасьць у справе кіраўніцтва і падпарадкаваньня інструктарскага апарату сакратарам акруговых і райённых выканаўчых камітэтаў і выключаваць усе іншыя формы падпарадкаваньня;

е) арганізаваць работу інструктарскага складу на плянавай сыстэме праз вызначэньне ў плян абъектаў і тэрміну правядзеньня інструктажу іх, праз складаньне праграм, па якіх павінна праводзіцца інструктарска-абсьледавацельская работа;

ж) усёй інструктарска-абсьледавацельскай рабоце надаваць характар ня толькі рэвізыйны, а ў найбольшай меры паказальна-практычны ў форме дапамогі і інструктаваньня працаўнікоў саветаў ці выканаўчага камітэту;

з) практыкаваць, як найлепшы метад вынуджэньня станоўчых і адмоўных бакоў у рабоце саветаў і выканаўчых камітэтаў, правядзеньне праверачна-інструкцыйнай работы пры ўдзеле шырокіх мас: праз агульныя сходы, сходы актыву, напыраныя пленумы саветаў, выканаўчых камітэтаў, сходы грамадзкіх арганізацый, сэкцыі, рэвізыйныя і іншыя камісіі.

Праверку на канцылярскіх матар'ялах скарыстоўваць як другарадную і толькі падсобную форму вынуджэньня работы абсьледуем га савету ці выканаўчага камітэту.

Адначасова ўвязаць праверачна-інструкцыйную работу з установамі і арганізацыямі, скарыстоўваючы матар'ялы, якія ў іх ёсьць, з мэтаю больш поўнага вынуджэньня дзейнасьці саветаў;

і) па вытвараньні праверачна-абсьледавацельскай работы і на падставе вывучэньня гэтых матар'ялаў зрабіць адпаведныя вывады таксама пры ўдзеле мас, абгаворваючы вывады на шырокіх пасяджэньнях пленуму, актыву і інш., што дапаможа вышчыць памылкі і дасьць магчымасьць адбіць у выніках найбольш поўную справаздачнасьць;

к) заканчэньні праверку і зрабіўшы вывады, што складае першы этап работы інструктажу, інструктаро ім складам праводзіцца практычнае інструктаваньне прадпрыемстваў абсьледаванага райвыканкому альбо савету ў форме абгаворваньня вываляў, вызначэньня практычных мерапрыемстваў па вышчэньні вынуджаных недахопаў і перашкодаў у іх рабоце, у форме ўдзелу ў пасяджэньнях пленуму прэзыдыуму, на сходах насельніцтва і аказаньня дапамогі ў вырашэньні практычных пытаньняў плянавай і бягучай работы савету альбо выканаўчага камітэту.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Кацкевіч.

27 сьнежня 1928 г., г. Менск.

ЦИРКУЛЯРНО.

Всем окружным исполкомам БССР

ОБ УСОВЕРШЕНСТВОВАНИИ ДЕЛА ИНСТРУКТАЖА СОВЕТОВ И РАЙОННЫХ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫХ КОМИТЕТОВ.

III Сессия Центрального Исполнительного Комитета БССР по докладу о массовой работе советов отметила недостаточность инструктирования работы последних со стороны вышестоящих исполкомов и приняла постановление об обеспечении качества инструктирования путем надлежащего подбора инструкторского состава исполнительных комитетов и организации инструктажа при более крупных районных исполнительных комитетах.

Во исполнение этого постановления, Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР принял решение о введении одной штатной единицы инструктора в районах, насчитывающих свыше 15 советов. Организация инструктажа даст возможность улучшить руководство организационно-массовой работой советов в крупных районах, чего почти нельзя было осуществить до сего времени. Организация института инструкторов при райисполкомах не разрешает полностью вопросов укрепления и улучшения руководства массовой и практической деятельностью советов. Осуществление этой задачи может быть достигнуто при условии правильной организации инструкторского аппарата, правильной и систематической организации его работы.

Исходя из этого, Президиум Центрального Исполнительного Комитета предлагает всем окрисполкомам:

а) полностью заместить инструкторские должности при окружных исполнительных комитетах, а также при районных исполнительных комитетах (в которых они по норме установлены), подбирая на эту должность работников с достаточной квалификацией (соответствующей квалификацией руководителей инструктируемого исполкома или совета) и практическим стажем советской работы (2—3 года работы в совете или исполкоме);

б) обеспечить инструкторскому составу окружных и районных исполнительных комитетов наиболее продолжительный период пребывания на инструкторской работе и ни в коем случае не допускать нарушения минимального однодичного срока работы инструктора;

в) обеспечить за инструкторским составом окружных и районных исполнительных комитетов возможность проведения широкой инструкторской работы и не допускать нагрузки инструкторского состава разной технической мелкой работой или использования его не по назначению;

г) предоставить наиболее полную возможность инструкторам повышать свою квалификацию путем обеспечения их соответствующей литературой, периодического проведения совещаний инструкторского состава, вовлечения их в работу пленумов и президиумов исполкомов и советов;

д) установить однообразие в деле руководства и подведомственности инструкторского аппарата секретарям окружных и районных исполнительных комитетов и ликвидировать все прочие формы подведомственности;

е) организовать работу инструкторского состава по плановой системе путем указания в плане об'ектов инструктажа и срока его проведения путем составления программы, по которым должна проводиться инструкторска-обследовательская работа;

ж) всей инструкторско-обследовательской работе придавать характер не только ревизионный, а в большей мере показательно практический в форме помощи инструктирования работников советов или исполнительного комитета;

з) практиковать, как наилучший метод выявления положительных и отрицательных сторон в работе советов и исполнительных комитетов, проведение проверочно-инструкторской работы, при участии широких масс; через общие собрания, собрания актива расширенные пленумы советов, исполнительных комитетов, собрания общественных организаций, секций, ревизионные и прочие комиссии.

Проверку канцелярских материалов использовать как второстепенную и для вспомогательную форму выявления работы обследуемого совета или исполнительного комитета.

Одновременно согласовать проверочно-инструкторскую работу с учреждениями и организациями, использовавая имеющиеся у них материалы с целью более полного выявления детальности советов;

и) после проведения проверочно-обследовательской работы и на основе изучения этих материалов делать соответствующие выводы также при участии масс, обсуждая выводы на расширенных заседаниях пленума, актива и проч., что даст возможность устранить ошибки и отразить в выводах наиболее полно действительность;

к) по окончании проверки и разработки выводов, что составляет первый этап работы инструктажа, инструкторским составом проводится практическое инструктирование работников обследуемого райисполкома или совета в форме обсуждения выводов, намечания практических мероприятий по устранению выявленных недостатков и принятий в их работе, в форме участия на заседаниях пленума, президиума, на собраниях населения и оказания помощи в разрешении практических вопросов плановой и текущей работы совета или исполнительного комитета.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Кацкевич.

27 декабря 1928 года, г. Минск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб палабаненьні тав. Пастройтэра, Паўла Барысавіча ад абавязкаў Намесьніка Сталага Прадстаўніка БССР пры ўрадзе Саюзу ССР і аб назначэньні тав. Ясюкова, Ігната Янкава Намесьнікам Сталага Прадстаўніка БССР пры ўрадзе Саюзу ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Аслабаніць тав. Пастройтэра, Паўла Барысавіча ад абавязкаў Намесьніка Сталага Прадстаўніка БССР пры ўрадзе Саюзу ССР.

2. Назначыць тав. Ясюкова, Ігната Янкава, Намесьнікам Сталага Прадстаўніка БССР пры ўрадзе Саюзу ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Кацкевіч.

5 студзеня 1929 году, г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об освобождении тов. Постройтера, Павла Борисовича, от обязанностей Заместителя Постоянного Представителя БССР при правительстве Союза ССР и о назначении тов. Ясюкова, Игнатия Ивановича, Заместителем Постоянного Представителя БССР при правительстве Союза ССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

1. Освободить тов. Постройтера, Павла Борисовича от обязанностей Заместителя Постоянного Представителя БССР при правительстве Союза ССР.

2. Назначить тов. Ясюкова, Игнатия Ивановича Заместителем Постоянного Представителя БССР при правительстве Союза ССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Кацкевич.

5 января 1929 г. г. Минск.

Галоўлітбел 595.

Антысэміты перад пралетарскім судом.

Знаць ня знаем, ведаць ня ведаем.

Другое судовае пасяджэньне Вярхоўнага Суду па справе Баршай пачынаецца допытам падсуднага Тулякова. Малады хлопец, некалькі год працуе на заводзе, працаваў супольна з Баршай і Тачыліным. Характэрнай асаблівасьцю ў паказаньнях Тачыліна, Груздова, Тулякова і інш. гэта імкненьне паказаць суду, што яны людзі цёмныя, малапісьменныя. Што-ж датычыцца да самага факту зьдзеку з работніцы Баршай, то ўсе яны, як-бы згаварыўшыся, стаяць на адным: «Нічога ня ведаем, нічога не рабілі, нічога ня бачылі». Бачыце, яны ня толькі не чапалі, ня білі і ня лаялі Баршай, але, наадварот, жылі з ёй дружна. Праўда, Тачылін і інш. далі Баршай мянушку «Турка», але гэта таксабе, па-таварыску.

Адным словам, перад судом не антысэміты, не жыдаеды, з языка якіх ня сходзіла лаянка і „жыдоўская морда" і інш., якія ня крыўдзілі чалавека, за тое, што ён толькі яўрэй, а проста несьвядомыя людзі. Іх сьвядомасьць даходзіць да такога абсурду, калі падсудныя прыкідваюцца, што ня ведаюць самых простых рэчаў, не разумеюць самых звычайных паняцьцяў.

Адным словам, наша хата з краю, мы нічога ня знаем.

Паказаньні Тачыліна, Тулякова і інш. разварачваюць перад судом сумны малюнак застою ў галіне культ-асьветнай і палітычнай працы на заводзе. Са слоў Тулякова відаць, што ніхто ня цікавіўся ўцягнуць найбольш адсталых рабочых у гурткі, у камсамол. Тулякоў нават ня ведае ці існавала на заводзе камсамольская ячэйка. Праўда, тут ёсьць шмат прытворства, але ёсьць і доля праўды.

Тулякоў ужо да гэтага яшчэ раней прыцягваўся да судовай адказнасьці па 88 арт. Кр. Кол., гэта хоць малады але бывалы хлапец.

— Ці бачылі вы або чулі,—задае пытаньне т. Валасевіч Тулякову,—як крыўдзілі Баршай?

— Не, ня бачыў і ня чуў, коратка, але выразна адказвае падсудны.

А сам ён, барані бог, ня толькі ня крыўдзіў яе, але нават быў прыяцелем яе, і бачыў яе заўсёды вясёлай шчасьлівай.

Допыт падсуднага Красьнянскага (б. міліцыянэр на заводзе) прабівае браш у сьцяну прытворства іншых падсудных.

— Нават 10-ці гадовы малец,—кажа Красьнянскі,—даў-бы адказ на такія запытаньні.

Заслона крыху падымаецца.

Паказаньні падсуднай Ніціеўскай крыху падымаюць заслону нічога пяведаньня і бязгрэшнасьці, у якой хітра імкнуцца захаваць сваю сапраўдную істоту падсудныя Тачылін, Груздоў і Тулякоў.

На запытаньне суду, ці прызнае яна сябе вінаватай, Ніціеўская адказвае: часьць за прызнаю.

Крок за крокам разьвярнуўся перад судом малюнак грубых адносін на заводзе да жанчын, брыдкая лаянка, мацюкі і г. д. У часе перапынку аблівалі адзін другога вадой, барукаліся, наогул жарты часамі прымалі дзікі ны на заводзе.

Работніцы ў кабале ў майстроў.

Ніціеўская апавядае суду аб тых цяжкіх жыцьлёвых варунках, у якіх прыходзіцца жыць частцы работніц на заводзе «Кастрычнік». Майстры баруць па кватэру толькі тых работніц, якія згаджаюцца абмываць, абшываць гаспадароў; ты-жа работніц, якія не згаджаюцца быць парабчанкамі, майстры атмаўляюцца браць на кватэру, у выніку такога становішча работніцы ня могуць хадзіць на сходы, ня могуць займацца культ-асьветнай працай.

Характар.

Ніціеўская не прызнае сябе вінаватай у тым, што аблівала вадой Баршай. Яна абліла вадой Тачыліна, Груздова і Тулякова, калі яны кінулі на зямлю Баршай.

Далей Ніціеўская апавядае, што Тачылін і Груздоў глумліліся над Баршай.

Аднойчы Ніціеўская паскардзілася Баршай, што Тачылін і Груздоў абарвалі ёй гумалястыку на панталонах.

— Словы «жыд», «жыдоўка»,—кажа Ніціеўская,—былі даволі пашыранымі на заводзе.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Мечакрвыканкому.

ПАБУДОВА НОВЫХ ЗАВОДАЎ.

Досьледы горачага адзелу ВСНГБ устанавілі, што ў Койданаўскім райёне ёсьць вялізарныя залежы крэйды—звыш 7.000.000 пуд.

Прэзыдыум Акрвыканкому пастанавіў пабудаваць у бягучым годзе крэйдавы завод з вытворчасьцю ў 250 300.000 пуд. у год і завод на вырабу вапны з гадавой вытворчасьцю ў 200.000 пуд. У сувязі з недахопам цэмэнту, вырашана фарсіраваць пабудову вапнавага заводу з разрахункам, каб у будаўнічым сэзоне 1929 г. выпаліць магчымальную колькасьць вапны.

Прэзыдыум АВК лічыць необходным правесьці досьледы залежаў крэйды ў Фанівалі і Бакавіне.

ВЫНІКІ ЗАГАТОВАК.

Па сена-лёну квартальны плян выкананы на 114,5 проц., валакна-лёну—на 114,6 проц., мяса—на 117,8 проц., буйнай скурсыравіны—на 143,5 проц., дробнай—на 99,7 проц., шчаціне—на 114,1 проц., коновласу—на 120,4 проц., памольнага збору—на 102,8 проц.

Прэзыдыум АВК адзначыў слабую працу с-гаса. канцэрацыі ў загатоўках сена і валакна-лёну, Белдзяржгандлю—па сенажнаю і шчаціне. Асабліва слабо стаіць справа ў Белмясгандлі, які выканаў толькі 4,3 проц. свайго заданьня. Слабо стаіць справа і ў галіне збору закантрактаваных прадуктаў.

Прэзыдыум АВК запрапанаваў узмацніць загатоўкі па ўсіх відах сыравіны. Побач з гэтым запрапанавана райвыканкомам і Акрселкредытсаюзу прымаць больш рашучыя меры да збору закантрактаваных культур.

КАМПАНІЯ ПА САМААБКЛАДАНЬНЮ ЯШЧЭ НЕ РАЗГАРНУЛАСЯ.

Прэзыдыум АВК, заслухаўшы даклад Акрфінадзелу аб ходзе самаабкладаньня на 1928-29 г., адзначыў, што самаабкладаньне па акрузе праходзіць слаба. Інфармацыя з месц аб ходзе кампаніі таксама паступае вельмі слаба, а з Баразінскага і Халопеніцкага райёнаў дагэтуль няма ніякіх вестак аб правядзеньні самаабкладаньня.

Райвыканкомам даручана скарыстаць для працы па правядзеньню сам абкладаньня працаўнікоў, якія выехалі з Менску для правядзеньня перавыбарчай кампаніі. Акрфінадзелу даручана накласьці дысцыплінарнае ўзысканьне на загадчыкаў фінчастак, якія не дадуць вывестак аб ходзе самаабкладаньня.

Удзел прафсаюзаў у „аглядзе чырвонай казармы".

Гэтымі днямі пры культадзеле ЦСПСБ адбылася шырокая культнарада, якая абгаварыла пытаньне аб удзеле прафсаюзаў у аглядзе чырвонай казармы.

Нарада выказалася за неабходнасьць пры правядзеньні агляду чырвонай казармы прафсаюзамі зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ўсёй рабочай масы ў агляд, а таксама і на азнаямленьне рабочых з жыцьцём і бытам чырвонаармейцаў.

У асноўным, агляд павінен будзе пайсьці па лініі шэфства прадпрыемстваў і саюзаў над адведнымі часьцямі Чырвонай арміі. Вызначана арганізоўваць масавыя паходы рабочых у казармы падшэфных часьцей, дзе будуць наладжвацца супольныя гутаркі на бягучыя тэмы і на тэмы аб патрэбах чырвонаармейцаў у культурных і бытавых адносінах. У час агляду будзе зьвернута асаблівая ўвага на палепшэньне казарменнага быту, а таксама на палепшэньне і абаталяваньне чырвонаармейскіх клюбаў і чырвоных куткоў.

ЦП саюзу працасьветы даручыць культкамісіям і спэцыяльным тройкам па асобных часьцях абсьледаваць патрэбы апошніх у справе разгортваньня дадатковых ліквідпунктаў і вечарніх агульнаадукацыйных школ, абслугоўваньне якіх павінна праводзіцца членамі саюзу ў парадку грамадзкай працы.

ЦП саюзу працаўніковай мастацтва окарыстае агляд для праверкі ўсёй сваёй працы ў галіне мастацкага абслугоўваньня Чырвонай армі. Побач з гэтым будуць прыцягнуты кваліфікаваныя сілы артыстаў, музыкаў і мастакоў для арганізацыі канцэртацыі чырвонаармейскіх гурткоў.

ЦП медсанпрацы супольна з Домам санасьветы маюць на ўвазе вызначыць дастатковую групу дактароў і іншых працаўнікоў для азнаямленьня з санітарным становішчам казармы і з гігіенай у быце чырвонаармейцаў. Побач з гэтым мяркуецца аказаць дапамогу мэдперсаналу Чырвонай армії ў санасьветпрацы ў казармах, клюбах і чырвоных куткох.

Культнарада рэкамэндавала саюзам арганізаваць масы для непасрэднай дапамогі чырвонай казарме асабістай працай шляхам правядзеньня недзельнікаў па рамонту і дабаталяваньню казарм.

Перад вясенькай сяўбой.

Менскае жыхарства зьбірае попел.

У прэзыдыуме Менскага гарсавету быў заслухан даклад аб мерапрыемствах па зьбіраньню попелу. Было пастаноўлена зьвярнуцца да ўсяго насельніцтва г. Менску, дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў зьбіраць і захоўваць попел.

Узмацненьне тэмпу зернаачышчэньня.

Менскі Арза зараз праводзіць актыўную кампанію за ўзмацненьне тэмпу зернаачышчэньня. Дзеля праверкі працы на мясцох і прыняцця адпаведных мер у выпадку тармажэньня зернаачышчэньня выехала на раёны 5 аграпрацаўнікаў Менакрза.

Вынікі амністыі ў Меншчыне.

Паводле амністыі ЦВК СССР да 10 згодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі па Менскай акрузе зьнята розных штрафаў на суму 68377 руб., звольнена ад адбываньня прымусовых прац 1715 чалавек і спынена 891 справа.

Шаўкоўніцтва на Беларусі.

ВСНГ БССР адвесьціў 500 руб. на вывучэньне магчымасьці разьвядзеньня морвы шаўкаводзтва ў нашых умовах. У некалькіх пунктах БССР летась былі арганізаваны зарасьнікі з морвы. У яўрэйскай фэрме Кураеўшчыне высаджана 300 саджанцаў морвы: апроч гэтага будзе разводзіцца трэвністая расьліна «Скарзанера», якая таксама можа скарыстоўвацца на харчаваньне шаўкавічных вусеняў.

З вясны нагтуляга году распачнецца больш плянавае выхарчоўваньне шаўкавічных вусеняў. Грэна (яйкі) будуць выкладжаны ў Менску, а пазьня ўжо вусені будуць разьмяркоўвацца па пасадзібных пунктах. Але ёсьць зарасьнікі морвы і скарзанэры.

Шаўкавічныя коканы, выпадаючыя ў БССР, вельмі лёгка разматваюцца і па сваёй якасьці не ўступаюць горшымі, чым коканы больш паўднёвага паходжаньня.

Падрыхтоўка менгарсавету да справаздачнай кампаніі.

Учора адбылося чарговае пасяджэньне выбарчай камісіі Менгарсавету.

На пасяджэньні былі заслуханы даклады аб удзеле радыёстанцыі, культадзелу ЦСПСБ і жыллагарэрацыі ў справаздачнай кампаніі Менскага гарсавету.

Радыёстанцыя арганізуе 27 студзеня радыёмітынг, прысьвечаны справаздачнай кампаніі Менгарсавету.

У час справаздачнай кампаніі на цэнтральных вуліцах і акраінах гораду (на Камароўцы і Серабранцы) будуць устаноўлены гучнагаварыцелі. А трэба гэта а, Менская радыёстанцыя будзе штодзённа перадаваць інфармацыю аб ходзе справаздачнай кампаніі на Менску.

Па дакладу культадзелу ЦСПСБ прынята пастанова аб забяспячэньні ўсіх клюбаў Менску для правядзеньня там справаздачных сходаў. На пасяджэньні было адзначана, што культадзел ЦСПСБ яшчэ не разгарнуў дастат ова падрыхтоўчую працу да правядзеньня справаздачнай кампаніі Менгарсавету.

Выбарчая камісія зацьвердзіла календарны плян справаздачнай кампаніі на першыя 10 дзён.

У першыя дні справаздачнай кампаніі адбудуцца справаздачныя сходы на заводзе „Камунар", Эльводу, фабрыка «Меншэй» і МБК.

Выбарчая камісія ўзьняла халайнітства перад прэзыдыумам Менгарсавету аб выданьні пастановы, на якой хатнія працаўніцы ў дні справаздачных сходаў павінны быць ослабаненыя ад працы.

Здарэньні.

Гвалт над малалетняй.

Чорнарабочы гр. Міхановіч Аляксей 17 год, які ў працягу вялікага часу гвалціў 7-хгадовую дзяўчынку, Міхановіч затрыманы і прыцягваецца да судовай адказнасьці.

Пажажоўшчына.

У в. Трасьцянец у 12 в. ад Менску ў час вясельля груза кулігану в 6 чалавек нанесла цяжкія нажавыя раны брагом Красуцкім, якія у цяжкім становішчы дастаўлены у менскую больніцу.

Хуліганы затрыманы і прыцягваюцца да адказнасьці.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісы:

1. «Біблія». Кніга быцьця. Крапіва. Выданьне другое. Стар. 86, цана 50 кап.

2. „Збор твораў". Янкі Купалы. 3 крытычна-біяграфічным нарысам і партрэтам аўтара. Том першы. Выданьне другое. Стар. 381, цана 2 руб. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

3. «Червоний шлях» № 12 за 1928 г. Грамадзка-палітычны і літаратурна-навуковы журнал. Стар. 260, цана 1 руб. 60 кап. (Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны).

4. «Международная жизнь № 12 за 1928 г. Стар. 100, цана 1 руб. 25 кап. Выданьне Народнага Камісарыяту Замежных Спраў. Масква.

Т. т. ваенкоры!

З 1-га студзеня да 24 лютага г. г. праводзіцца «Агляд Чырвонай Казармы».

У дасылаемых матар'ялах аб гэтай кампаніі неабходна асьвятляць наступныя пытаньні:

1) Палепшаньне кватэрных умоў чырвонаармейцаў і камандзнага складу.

2) Што робіцца ў галіне шэфства рабочых арганізацый над Чырвонай армією.

3) Як абслугоўваюцца вайсковым часьці саюзамі—працасьветы і мастацтва (ліквідацыя непісьменнасьці, клюбная праца і г. д.).

4) Культурнае абслугоўваньне Чырвонай арміі (чайныя і інш.).

5) Аздараўленьне санітарна-гігіенічных умоў казармы і жыцьця чырвонаармейцаў.

6) Удзел у „Агляде Чырвонае Казармы" грамадзянскіх арганізацый.

СВОДКА № 4

аб ходзе перавыбараў сельсаветаў у 1929 годзе ў параўнаньні з данымі 1926 27 г.

(Весткі даюцца па тэлеграфу ад райёнаў 13 студзеня 1929 г.)

	1928 29 г.	1926-27 г
1) Перавыбрана	89 сельсаветаў	—
2) Ад насельніцтва ва ўзросьце звыш 18 год	109949 чал.	—
3) З іх пазбаўлена выборчага права	2 263 „ 2,1 пр.	1,4 проц.
4) Агульны лік выбаршчыкаў	107686 „ 97,9 „	98,6 „
5) З іх: жанчын	55472 „ 51,5 „	—
6) Зьявілася на выбары	60147 „ 55.9 „	46 6 „
7) З іх: жанчын	21823 „ 39.3 „	26,4 „
8) Усяго выбрана членаў сельсаветаў	2237 —	—
9) З іх: жанчын	446 „ 19 9 „	7,2 „
10) Па партыйнасьці:		
а) камуністых	195 „ 8,7 „	9,3 „
б) камсамольцаў	210 „ 9,4 „	9,0 „
11) Па нацыянальнасьці:		
а) беларусаў	2039 „ 91,2 „	91,5 „
б) яўрэяў	63 „ 3,0 „	2,2 „
в) расейцаў	33 „ 1,5 „	2,6 „
г) палякаў	70 „ 3,1 „	2,2 „
д) іншых	27 „ 1,2 „	1,5 „

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

ПАВАЖАНЫ тав. РЭДАКТАР!

Ніхто не будзе сярчацца, што для нашай савецкай навукі патрэбная выдумляцца сувязь з замежнай навукай; таксама ня зможа пасоўвацца добра наперад і замежная навука без гэтай сувязі. Сувязь гэта можа ажыцьцяўляцца розным спосабам, і адным з іх з'яўляецца інфармацыя аб нашых дасягненьнях у замежных чыста-навуковых часопісах, а таксама інфармацыя аб дасягненьнях замежнай навукі ў нашых навуковых органах.

Усьведамляючы гэтую патрэбу, я і даў згоду вымяніць маё прозьвішча ў ліку супрацоўнікаў часопісу «Ruch Słowiański», калі на пачатку 1928 г. з адпаведным лістом зьвярнулася да мяне рэдакцыя гэтага часопісу. Пабачыўшы на чале рэдакцыі вядомага мовазнаўцу праф. Лера-Сплавінскага, які ня мала ўвагі аддаў „русским мовам", ведаючы добра, што ў Польшчы ёсьць і іншыя славісты (напр., праф. Віч, а таксама раней шыя маскоўскія і ленінградзкія прафэсары), якія этнаграфічным межы паміж польскай мовай, з аднаго боку, і ўсходня-славянскімі, з другога, праводзяць такім чынам, які цалком задавольвае як грамадзянінаў БССР, так і УССР,—узяўшы ўсё гэта пад увагу, я не адважыўся пакрыўдзіць недавер'ем рэдакцыю заначыцца ў часопісу, якая запэўнівала ў сваім лісьце, што charakter „Ruchu Słowiańskiego" ma być apolityczny, ściśle rzeczowy, głównie informacyjny». Адным-ж ніводзін з славістычных часопісаў, якія дагэтуль запрашалі савецкіх навуковых супрацоўнічаць у іх „Slavia", «Zeitschrift für slavische Philologie» (нар.) не адхіляўся ад чыста-навуковага, кадэмічнага кірунку.

Але-ж калі выйшлі ў сьвет першыя нумары «Ruchu Słowiańskiego», я пабач ў, што вельмі памыліўся, сакрыўшы запэўненьнем яго рэдакцыі. У першых-жа нумарох выявілася тэндэнцыйнасьць гэтага часопісу, які бесспрачна нарожа адносіцца да СССР. Гэтая варожасьць выяўляецца нават у тэндэнцыйным падборы інфармацый.

«Ruch Słowiański», напр., ведыш абрэдаваўся тым, што ў нас яшчэ дагэтуль існуюць людзі, якія ходзяць да царквы, не зайшо ны нічога пільнейшага. (прыкмеці для сябе) у нашым культурным жыцьці. Але калі ўжо гаварыць аб культурным руху ў славянскіх народаў, як можна абмінуць такі вялі нага значэньня факт у жыцьці славян,—як можна не сказаць аб тым, што толькі ў СССР у сувязі з асаблівым ня ацэньным нацыянальнага пытаньня зьявілася, нарэшце, магчымасьць зразьвіцьця беларускую і украінскую мовы ў правох з іншымі славянскімі мовамі, як можна абмінуць росквіт сучаснай укр. і белар. навукі і літаратуры. Рэдакцыя «Ruchu Słowiańskiego» ва ўсім разе вельмі добра ведае хоць аб тым, як заходнія часткі Беларусі і Украіны прагнуцца жадаюць і сабе такога лёсу, які ўжо зазнаілі іх усходнія браты.

Гэткім чынам, для мяне цалкам высьветлілася, што «аналітычны» «Ruch Słowiański» толькі адзін з этапаў антысавецкай палітыкі, якая ў асобе гэтага часопісу рэшыла заклікаць да сябе на службу „чыстую навуку".

Ахоўваючы свой гонар савецкага вучонага, я лічу ганебнай для сябе усялякую сувязь з часопісам „Ruch Słowiański", аб чым я і паведамляю як рэдакцыі гэтага часопісу, так і савецкую прэсу. Няма ў мяне сумненьня і ў тым, што і іншыя савецкія вучоныя, прозьвішчы якія на вышэй зазначаны прычыне падалі ў лік супрацоўнікаў польскага часопісу, таксама падалі аб тым, каб іх часовае імя засталося не ацэньным.

З таварыскім прывітаньнем

праф. П. БУЗУК.

Папраўка.

На недагляду карэктуры ва ўчарашнім нумары нашае газэты на 3 стар. у канцы пастановы Савету Народных Камісараў БССР укралася памылка: надрукавана «20 сьнежня 1929 году», а павінна быць: «20 сьнежня 1928 году».

Паштовая скрынка.

— Н. Афанасьеву—„Атуканцам няма літасьці ў пралетарск м судзе, Г. Ш.—„Дабём вылазкі антысэмітызму"—ня пойдзе, няма фактаў.

— Сергею Асоту—«Праблемы рабіна Каца», Я. Падрэцкаму—«Абураючая вылазка клясавага ворага»—ня пойдзе, на гэтыя тэмы ўжо было.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня спэктакль у Белдзяржтэатры для саюзу працасьветы (білеты вечар). Білеты, якія засталіся ў касе тэатру, ад 6 гада, увеч.

— У пятніцу, 18-і сход клюбных упаўнаважаных, старост гурткоў і масавай камісіі—а 7 гадз. увеч.

— У суботу 19-і выступленьне БелАПП'а і пастаноўка «Бесня на вогнішчы».

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

КІНО-ТЭАТР.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

ЧАЦЬВЕР, 17 СТУДЗЕНЯ

САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ

БАЛЕТНЫ ВЕЧАР.

Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	З аўторка 15 студзеня. Мастацкі баявік Межрабпом-фільм. Масква—Праматэус Бэрлін. „Саламандра". У галоўн. ролі Бэрнгард—Гётнэ.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка 15 студзеня „Сапраўдны джэнтльмэн" Звыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 47.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З аўторка, 15-га студзеня 1) „Апошні рэйс" 2) „Каханьне і спорт"
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З аўторка 15 студзеня. 1) „Браняносец Пацёмкін" 2) „Ася" Пачатак а 7 гадзіне
1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»).	„ВАСЯ РЭФАРМАТАР" у 6 частках. Кошт білету 10 кап.

КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" апавяшчае падпісчыкаў, што

РОЗЫГРЫШ ЛЁТАРЭІ

АДБУДЗЕЦЦА

20 студзеня 1929 г. а 12 гадз. дня

у памяшканьні рэдакцыі газэты.

Запрашаюцца ўсе жадаючыя прысутнічаць.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Сьвідроўскі білет № 281969 Апанасовіча М., выд. Н.-Барысаўскім саюзам хімікаў, кв. 381.

— Кандэрац. кніжка Барухіна І. М., выд. МЦРК, кв. 382.

— Кандэрац. кніжка Шаршэва І. І., выд. МЦРК, кв. 383.

— Сьвідроўская кніжка за № 61587 Акура Х. І., выд. саюзам Рабіс, кв. 384

— Сьвідроўская кніжка № 931598 Гапановіча Г. О., выд. Менск. саюзам мэтэлістаў, кв. 385.

— Пашпарт Гапановіча Г. О., выд. Менакрміліц., кв. 386.

— Сьвідроўская кніжка № 61356 Фраймана І. Я., выд. саюзам Рабіс, кв.